ПРАЛЕТАРЫ ЗЛУЧАЙЦЕ ВСЕХ КРАЁЎ

ЗЬВЯЗДА

№ 267 (3375) Субота 23 лістапада 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 83
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, гаўтоўка—781

ВЕНА, 22. У Сафіі (Баўгарыя) пачаўся масавы працэс над 52 рабочымі на-чале з тав. Стаянавым, які абвінавачваецца ў тым, што ён быў сакратаром нелегальнай баўгарскай кампартыі. На суд выклікана звыш 100 сьведак. Працэс пачаўся допытам тав. Стаянава.

Сяляне в. Дудзічы, Самахвалавіцкага раёну, Менскай акругі ў колькасьці 54 двароў уступілі ў калгас, які быў названы імям Камуністычнага унівэрсытэту Беларусі. На сваім арганізацыйным сходзе сяляне вынесьлі шчырую падзяку свайму шэфу-Камуністычнаму ўнівэрсытэту Беларусі імя Леніна, які дапамог ім правільна зразумець палітыку кампартыі ў сацыялістычнай перабудове вёскі

Адставаньне ў загатоўках харчовых культур--уступка кулаку

Апошнія весткі аб ходзе загатовак у Беларусі адзначаюць выкананьне заданьня па збожжавых культурах амаль усімі акругамі. Адстаюць толькі **Бабруйская і Мазырская** акругі. Ёсьць усе падставы меркаваць, што павялічаны плян загатовак збожжавых культур будзе выкананы да 1-га сьнежня нават з некаторым перавышэньнем.

Відавочна, гэты факт стварае дэмабілізацыйны настрої сярод мясцовых арганізацый і хлебазагатоўшчыкаў, якія лічаць сваю задачу на хлебазагатоўчым фронце ўжо вырашанай. Між тым, для такіх настрояў у нас няма ніякіх падстаў. На фронце загатовак у БССР ёсьць рад вялікіх прарываў, на ліквідацыю якіх павінны быць кінуты сілы ўсіх партыйных, усіх савецкіх, усіх грамадзкіх арганізацый. Гэтыя прарывы—надзвычайна слабое паступленьне **харчовых культур і невыстарчальны націск на кулака.**

Апошняя зводка Наркамгандлю СССР (па 15-га лістапада) патрабуе да сябе пільнае ўвагі і сыгналізуе вялікую небясьпеку беларускім арганізацыям.

Падамо некалькі лічбаў.

У той час, як па ўсім Саюзе плян загатовак збожжавых культур выкананы на 92,8 проц., БССР дала 112 проц. і займае адно з першых месц, уступаючы толькі Заходняй, Іванаўскай краінам, Ніжагародзкаму краю і Башкірскай рэспубліцы.

Зусім іншы малюнак даюць даныя аб загатоўках **харчовых культур.** Па ўсім Саюзе загатоўлена 87,9 проц. пляну харчовых культур, а на Беларусі толькі 73,3 проц. БССР фігуруе ў зводцы Наркамгандлю СССР сярод краін, якія адстаюць, побач з Сібірам, Казакстанам, Далёка-Ўсходнім краем і Крымам. Наперадзе Беларусі стаіць нават Паўночна-Каўказкі край, які нагул не дабіўся патрэбнага тэмпу і загатовіў толькі 67,6 проц. пляну збожжавых культур.

Чым тлумачыць такое слабое паступленьне харчовых культур па БССР? **Толькі невыстарчальным націскам на кулака.**

Асаблівасьць клясавай барацьбы за хлеб у гэтым годзе заключаецца ў тым, што кулак зацікае найбольш выгодныя для яго харчовыя культуры здаючы проса, ячмень, авёс. Нашы арганізацыі ня ўсюды прымусілі кулака здаваць жыта і пшаніцу. Невыстарчальны націск часамі ішоў побач з грубым скажэньнем клясавай лініі, давядзеньнем цьвёрдых заданьняў да серадняковуі нават беднякоў.

У апошні час у асобных мясцох наглядаецца нават паслабленьне націску на кулака. Так, напрыклад, «Камунар Магілеўшчыны» паведамляе, што некаторыя сельсаветы, супакоіўшыся на дасягнутых посьпехах, сталі памяншаць цьвёрдыя заданьні кулаком, ня гледзячы на тое, што яны (заданьні) былі даны сходамі беднаты і сераднякоў.

У загатоўках харчовых культур патрэбен рэзкі і рашучы пералом. Адставаньне ў загатоўцы харчовых культур—уступка кулаку. Трэба зламаць кулацкае супраціўленьне, трэба прымусіць кулака здаваць жыта і пшаніцу.

Дэмабілізацыя на загатоўчым фронце недапушчальна. Гэта павінны памятаць нашы нізавыя арганізацыі і прэса. На жаль, акруговая прэса ў апошні час паслабіла ўвагу да хлебазагатовак, адводзячы ім на сваіх старонках вельмі мала месца.

Апошні тэрмін выкананьня дадатковага заданьня—1-га сьнежня. Застаўся толькі тыдзень. За гэты кароткі час мы павінны **пабаявому** паставіць работу. БССР павінна заняць адно з першых месц у Саюзе ня толькі па загатоўках збожжавых культур, але і харчовых.

Бесьперапынка патрабуе рашучай зьмены форм масавай работы

Задачай партыйнай арганізацыі зьяўляецца ў мінімальны тэрмін забясьпечыць выкананьне найважнейшай пастановы партыі аб пераходзе на бесьперапынку. Але ажыцьцяўленьне гэтай дырэктывы на мясцох ідзе злачынна марудным тэмпам. У большасьці выпадкаў гэта марудносьць тлумачыцца не аб'ектыўнымі прычынамі, а нерашучасьцю, нягібкасьцю, нядбайнасьцю.

Зусім зразумела, што ўвядзеньне бесьперапынкі павінна закрануць усе бакі жыцьця ня толькі ўнутры прадпрыемства, але і па-за ім. Бесьперапынка павінна ўнесьці зьмены і ў быт рабочых. **Усё гэта выклікае неабходнасьць зьмяніць і формы, і мэтады масавай работы.** Трэба прыстасаваць работу так, каб ахапіць ёю **ўсіх** рабочых як старых, так і тых, што ўліваюцца ў прадпрыемствы ў сувязі з пераходам на бесьперапынку.

Пытаньне аб арганізацыйнай структуры партыйна-грамадзкіх арганізацый на прадпрыемствах павінна быць зараз канчаткова вырашана. На буйных прадпрыемствах, якія падзяляюцца на цэхі, павінна быць прыкладна наступная арганізацыйная структура:

На лініі **партыйнай:** бюро калектыву, цэхавая ці зьменавая парт'ячэйка, зьвенпартарганізатар; па лініі **прафсаюзнай:** агульна-фабрычны камітэт, цэхпрафбюро, прафупаўнаважаны ці прадстаўнік у аддзяленьні; па лініі вытворчых нарад: агульна-заводзкая вытворчая камісія, цэхавая вытворчая камісія, вытворчыя нарады; па лініі **камсамолу:** бюро калектыву, цэхавыя ячэйкі, зьвенавыя камсамольскія арганізатары; па лініі добраахвотных арганізацый: агульна-заводзкі камітэт, цэхавыя ячэйкі.

Гэта структура дапаможа згрупаваць усю работу ў цэху і дасьць рост новага партыйнага і беспартыйнага актыву. У сувязі з адзінаначальнем у прамысловасьці трэба вырашыць канчаткова пытаньне аб правах цэхавай **адміністрацыі.** Трэба таксама з усёй рашучасьцю паставіць пытаньне аб выхаваньні і ўмацаваньні кадраў цэхавага актыву. Да гэтага часу вышэйпаказаным пытаньням аддавалася мала ўвагі.

Як арганізаваць работу на прадпрыемствах у сувязі з пераходам на бесьперапынку? Перш за ўсё трэба адзначыць, што пры намячэньні плянаў работы трэба выходзіць з 10-цідзённі і 30-цідзеннага месяца па лічбах, а не па назвах дзён. Мне дучаецца, што 10-цідзённу на прадпрыемстве трэба скарыстаць наступным чынам:

Першы дзень—партыйны дзень, другі—прафдзень (або дзень масавай работы), трэці—дзень культурнага адпачынку, чацьверты—дзень вучобы, пяты—дзень культурнага адпачынку, шосты—дзень вучобы, сёмы—дзень грамадзкіх арганізацый і дзень (чарцёнца) заўкомаўскіх канфэрэнцый і сходаў, восьмы — дзень вучобы, дзевяты—дзень культурнага адпачынку, дзесяты—дзень камсамолу. Гэтага парадку дзён трэба строга прытрымлівацца. Толькі тады мы даб'емся **плянавасьці ў нашай рабоце.**

У прафдзень трэба абгаворваць важнейшыя прафпытаньні, падагульваць вынікі, правяраць выкананьне дырэктыў вышэйшых прафсаюзных арганізацый, практыку работы мясцовых прафсаюзных органаў, абгаворваць асобныя мерапрыемствы **партыі** і ўлады і г. д. Для ўдзелу ў прафдні павінны быць прыцягнуты партыйныя арганізацыі, адказныя кіраўнічыя прадаўнікі.

Высунутыя «дні культурнага адпачынку», зразумела, не азначаюць, што ў іншы час уся культурная работа замірае. Наадварот, яна павінна быць як мага больш узмоцненай ва ўсе дні работы і накіравана да максымальнага абслугоўваньня рабочых. Але тры дні культурнага адпачынку ў дэкадзе павінны быць асобнымі днямі, у якія рабочы атрымлівае лепшае з таго, што мы можам яму даць. Калектыўнае наведваньне **тэатраў і кіно, добра арганізаваная навуковая лекцыя, культурная** шклянка гарбаты, спорт, экскурсія і г. д.

Вялікую ўвагу заслугоўвае пытаньне аб забесьпячэньні **партыйнага ядра** ў кожнай зьмене, бо ў зьвязку з пяцідзённай будзе наглядацца перасоўка рабочых. Трэба разьмеркаваць партыйныя сілы так, каб **забясьпечыць партыйным уплывам кожную зьмену, кожную групу рабочых.** Партыйныя арганізацыі павінны паглыбіць якасьць сваёй работы.

Да гэтага часу **сацыялістычнае спаборніцтва** паміж ячэйкамі на лепшую пастаноўку масавай работы не практыкавалася. Трэба зараз паставіць пытаньне аб арганізацыі **сацыялістычнага спаборніцтва паміж асобнымі партыйнымі ячэйкамі,** а на буйных прадпрыемствах—паміж цэхавымі ячэйкамі на лепшую вярбоўку рабочых у партыю, на лепшае правядзеньне беларусізацыі, на лепшую пастаноўку масавай работы і г. д.

Такая форма сацыялістычнага спаборніцтва бязумоўна дапаможа ўзьняць якасьць партыйнай і масавай работы.

КОНЮХАЎ.

ПЛЕНУМ ЦК УсеКП(б)

АБ ВЫНІКАХ І ДАЛЕЙШЫХ ЗАДАЧАХ КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА

(Рэзалюцыя па дакладу тав. КАМІНСКАГА, ухваленая пленумам ЦК УсеКП(б) 17 лістапада 1929 г.)

I.

1. XV Зьезд партыі паставіў у якасьці асноўнай задачы партыі ў вёсцы «паступовы пераход распыленых сялянскіх гаспадарак на рэйкі буйное вытворчасьці». За апошнія два гады партыя дабілася буйнейшых посьпехаў у ажыцьцяўленьні гэтай дырэктывы XV зьезду.

СССР уступіў у паласу разгорнутай сацыялістычнай перабудовы вёскі і будаўніцтва буйнога сацыялістычнага земляробства.

На падставе разгортваньня вытворчай змычкі, масавай кантрактацыі і г. д. расьце вытворчае каапэраваньне сялянскіх гаспадарак, якое ўсё больш пераходзіць на вышэйшую ступень і перарастае ў калгасны рух. Сьледам за бедняком у калгасы пасунулася і серадняцкая маса. З уцягненьнем мільённых мас вёскі калгасны рух набывае рашучае значэньне ў ажыцьцяўленьні ленінскага каапэрацыйнага пляну.

Падагульваючы вынікі калгаснага будаўніцтва, неабходна адзначыць: шпаркі рост ахопу сялянскіх гаспадарак калгасамі; ажыцьцяўленьне новых арганізацыйных форм і мэтадаў калектывізацыі, у прыватнасьці, на падставе вопыту машына-трактарных станцый; будаўніцтва буйных калгасаў і ўзмацненьне іх ролі; ахоп калгасамі цэлых населішч; пераход да масавай калектывізацыі раёнаў і округ. Калгасны рух ставіць ужо задачу масавай калектывізацыі перад асобнымі галінамі.

Такія значныя посьпехі калгаснага руху зьяўляюцца простым вынікам пасьлядоўнага правядзеньня генэральнай лініі партыі, якое забясьпечвае магутны рост прамысловасьці, узмацненьне змычкі рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства, насаджэньне каапэрацыйнай гramадзкасьці, узмацненьне палітычнай актыўнасьці мас і рост матар'яльных і культурных рэсурсаў пралетарскай дыяржавы.

Разам з тым гэты бурны рост калгаснага руху ставіць перад партыяй рад новых, самых складаных задач, выяўляе новыя цяжкасьці і недахопы калгаснага будаўніцтва, з якіх важнейшымі ў сучасны момант зьяўляюцца: нізкі ўзровень тэхнічнай базы калгасаў; недастатковая арганізаванасьць і нізкая недастатковая прадукцыйнасьць працы ў калгасах; вострыя недахопы кадраў калгасьнікаў і амаль адсутнасьць необходных спэцыялістых; васьмечанасьць сацыяльнага складу ў частцы калгасаў; недастатковая прыстасаванасьць форм кіраўніцтва да маштабаў калгаснага руху, а таксама адставаньне ад тэмпу і размаху гэтага руху, і ня рэдка простая неадпаведнасьць кіруючых органаў калгаснага руху.

2. Шырокае разгортваньне калгаснага руху працякае ў абстаноўцы абвастрэньня клясавай барацьбы ў вёсцы і зьмены яе форм і мэтадаў. Побач з узмацненьнем простай і адкрытай барацьбы кулацтва супроць калектывізацыі, якая даходзіць да простага тэрору (забойствы, падпалы, шкодніцтва), кулакі ўсё часьцей пераходзяць да замаскаваных і скрытых форм барацьбы і эксплёатацыі, пранікаючы ў калгасы і нават у органы кіраўніцтва калгасаў, каб расклясці і ўзарваць іх з сярэдзіны.

Ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы асаблівае значэньне набывае пасьлядоўнае правядзеньне мерапрыемстваў па барацьбе з лжэ-калгасамі, якія зьяўляюцца сродкам замаскаваньня і абароны кулацкіх элемэнтаў вёскі.

Працягваючы і ўзмацняючы барацьбу супроць капіталістычных элемэнтаў вёскі, разгортваючы рашучае наступленьне на кулака, усіляк перашкаджаючы і перасякаючы спробы ўваходу кулакоў у калгасы, партыя павінна ўпартаю і сыстэматычнаю работай забясьпечыць згуртаваньне батрацка-бядняцкага асяродку ў калгасах. Гэта тым больш неабходна, што ў саміх калгасах, асабліва ў калгасах больш простага тыпу, паколькі ў іх далёка яшчэ не аграмаджаны ўсе сродкі вытворчасьці і наогул моцныя дробна-ўласьніцкія інтарэсы, застаецца значная небясьпека кулацкіх уплываў. У сувязі з гэтым асабліва неабходна ўсямернае ўзмацненьне аграмаджаных фондаў калгасаў, як асновы росту калгаснага руху, а таксама ажыцьцяўленьне трывалай сувязі калгасаў са ўсёй сыстэмаю савецкай гаспадаркі.

Важнейшай задачай партыйных арганізацый зьяўляецца ўсямернае ўзмацненьне ўдзелу і кіраўчага ўплыву пралетарскіх элемэнтаў гораду, пралетарскіх і поўпралетарскіх пластоў вёскі ў калгасным руху. Пры гэтым асабліва значэньне мае арганізацыя батрацка-бядняцкіх груп у прасьцейшых вытворчых каапэрацыйных аб'яднаньнях і ў першастковых формах калектыўных гаспадарак (таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі)

3. Дасягнуты размах калгаснага будаўніцтва перавысіў усе плянавыя меркаваньні, усё выразьней выяўляючы тое гіганцкае паскарэньне тэмпаў развіцьця сацыялістычнага будаўніцтва, якое прадбачыў Ленін.

Партыя з усё большым і большым посьпехам вырашае задачы пабудаваньня буйнай аграмаджанай сельскай гаспадаркі, тым самым выкрываючы капітулянцкую сутнасьць поглядаў правых апартуністых, накіраваных супроць палітыкі партыі ў галіне калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Партыя і рабочая кляса, неаслабна змагаючыся з апартуністычнымі элемэнтамі і прыміранцамі да іх у сваіх радох, разьвіваючы энэргічнае наступленьне на варожыя пралетарскай дыктатуры клясавыя сілы, рашуча павялі наперад бядняцка-серадняцкія масы вёскі па шляху сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Наперакор фальшывым «тэорыям» лідэраў правай апазыцыі аб «дэградацыі» сельскай гаспадаркі, мы маем на справе паскораны рост прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы на падставе быстрага разьвіцьця аграмаджанага сэктару і масавага ўздыму індывідуальных бядняцка-серадняцкіх сялянскіх гаспадарак.

Наперакор капітулянцкім «тэорыям» аб «урастаньні» кулака ў сацыялізм, наперакор панічным патрабаваньням правых апартуністых разьвязаць «свабодны зварот» для капіталістычных элемэнтаў і панізіць тэмп індустрыялізацыі і аграмаджаньня сельскай гаспадаркі, партыя праводзіць і будзе праводзіць курс на рашучую барацьбу з кулаком, на выкарчоўваньне карэньняў капіталізму ў сельскай гаспадарцы, на хутчэйшае аб'яднаньне індывідуальных бяднякоў - серадняцкіх гаспадарак у буйныя калектыўныя гаспадаркі, на падрыхтоўку ўмоў для разьвіцьця пляннавага прадуктаабмену паміж горадам і вёскай.

Вынікі сацыялістычнага будаўніцтва, якое разгарнулася, выяўляюць гіганцкія магчымасьці ўздыму прадукцыйных сіл сельскай гаспадаркі, заложаныя ва ўмовах савецкага ладу. Пачынаецца **новы гістарычны этап** сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі на шляхох узмацненьня вытворчай змычкі пралетарскай дыяржавы з асноўнымі бяднякоа-серадняцкімі масамі вёскі.

II.

4. Асноўная труднасьць калгаснага будаўніцтва ў сучасны пэрыяд заключаецца ў адсталасьці **тэхнічнай базы.** Буйную, высокапрадукцыйную і сапраўды сацыялістычную вытворчасьць у сельскай гаспадарцы можна пабудаваць толькі на базе сучаснай машыннай тэхнікі і электрыфікацыі. Таму першаступовае значэньне мае стварэньне матар'яльна - тэхнічнай базы для сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Пленум ЦК ухваляе пастанову Палітбюро аб пашырэньні пляну трактарабудаўніцтва і машынабудаўніцтва, аб неадкладнай пабудове двух новых трактарных заводаў з прадукцыйнасьцю па 50 тысяч трактараў (гусянічных) кожны, да пабудовы двух заводаў камбайнаў, пашырэньня заводаў складаных с.-г. машын, хэмічнай прамысловасьці і г. д. Неабходна таксама разгортваньне будаўніцтва электрастанцый і электрамашын для сельскай гаспадаркі і для пераапрацоўкі с.-г. прадуктаў. Усямернае разгортваньне гэтага будаўніцтва створыць неабходную тэхнічную базу для буйнога сацыялістычнага земляробства і неабходныя прадпасылкі для ажыцьцяўленьня каранное тэхнічнае рэвалюцыі ў сельскай гаспадарцы і для яе аграмаджаньня.

Пленум ЦК лічыць неабходным прыступіць да прыцягненьня сродкаў сялянскага насельніцтва на фінансаваньне гэтага будаўніцтва, у прыватнасьці, шляхам арганізацыі на трактарных заводах і заводах складаных с.-г. машын прыёму папярэдніх заказаў і практыкі задаткаў непасрэдна ад асобных калгасаў і іх аб'яднаньняў на трактары, камбайны, складаныя с.-г. машыны. Неабходна разгарнуць шырокую кампанію ў калгасах па ўтварэньні спэцыяльнага экспартнага фонду для закупкі імпартных трактараў.

Ва ўмовах масавага разгортваньня калгаснага будаўніцтва неабходна аддаваць усё больш увагі справе будаўніцтва буйных - машынізаваных калгасаў, якія павінны выкарыстаць у сваёй тэхнічнай арганізацыі вопыт саўгасаў, паступова ператвараючыся ў сапраўдныя сацыялістычныя прадпрыемствы, пабудаваныя на базе сучаснай машыннай тэхнікі і навейшых навуковых дасягненьняў.

Асабліва важнае значэньне ў справе будаўніцтва буйных калгасаў маюць мясцовыя пунктавыя машынна-трактарныя станцыі. Стваравоючы шырокую магчымасьць да выкарыстаньня перавагі сучаснай тэхнікі ў сялянскіх гаспадарках, машынна-трактарныя станцыі павінны стаць цэнтрам масавай калектывізацыі цэлых раёнаў.

Пленум ЦК ўхваляе стварэньне ўсесаюзнага цэнтру машынна-трактарных станцый (Трактарацэнтр) і ўваход яго ў агульную сыстэму калгаснага будаўніцтва (усесаюзны калгасцэнтр), як спэцыяльнага аўтаномнага цэнтру.

Пры наяўнасьці вялікага процанту бяз'інвэнтарных сялянскіх гаспадарак, пры вострым недахопе трактараў і складаных машын, важнейшая задача калгаснага будаўніцтва ў сучасны пэрыяд заключаецца ў тым, каб побач з будаўніцтвам вышэйшых форм калектывізацыі на перадавой тэхнічнай базе садзейнічаць мільёнам сялянскіх гаспадарак выкарыстаць з павышанай эфэктыўнасьцю і больш простыя прылады вытворчасьці ў межах больш простых калгасаў і каапэрацыйных вытворчых аб'яднаньняў. Важная роля належыць куставым аб'яднаньням калгасаў, высунутым ініцыятывай саміх калгасаў і цалкам апраўдаўшых сябе на практыцы калгаснага будаўніцтва. Арганізуючы сумеснае выкарыстоўваньне ў дробных калгасах складаных машын і трактароў, аб'яднаючы дробныя калгасы для суменснага будаўніцтва прадпрыемстваў, трактарных калён і буйных машынных станцый з конскаю або зьмешанаю цягавай сілай (у прыватнасьці шляхам рэарганізацыі існуючых пракатных пунктаў), куставыя аб'яднаньні павінны стаць вытворчымі цэнтрамі, якія падрыхтоўваюць неабходныя матар'яльна - тэхнічныя прадпасылкі для ўзмацненьня дробных калгасаў і масавага ўцягненьня ў іх вакольных сялянскіх гаспадарак.

Такім чынам, будаўніцтва буйных калгасаў павінна разьвівацца рознастайнымі шляхамі, у розных формах, пры бесьперапынным узмацненьні арганізуючага ўплыву сацыялістычнай прамысловасьці і буйных саўгасаў, пад кіраўніцтвам пралетарскай дыяржавы.

Задача партыі заключаецца ў тым, каб, улічваючы ўсю складанасьць і рознастайнасьць шляхоў пераходу дзесяткаў мільёнаў сялянскіх гаспадарак да буйнога сацыялістычнага земляробства, усямерна разьвіваць ініцыятыву і самадзейнасьць саміх мас у калгасным будаўніцтве, пры ўзмацненьні кіраўніцтва калгасным рухам з боку партыі і разьвіцьці новых форм сувязі і дапамогі рабочае клясы асноўным масам вёскі ў справе перабудовы сельскай гаспадаркі. Пры гэтым павінна быць значна павялічана і роля дзяржаўных, у першую чаргу зямельных, органаў у кіраўніцтве калгасным будаўніцтвам.

5. Карэнным недахопам калгаснага руху зьяўляецца параўнальна нізкая **прадукцыйнасьць працы,** недастатковая вытворчая дысцыпліна і адсутнасьць належнай увагі з боку кіруючых органаў калгаснага руху да справы арганізацыі працы ў калгасах. Таму ў кожным калгасе неабходна настойлівая і сыстэматычная барацьба за павышэньне прадукцыйнасьці працы, за падняцьце ўраджайнасьці, за павялічэньне таварнай прадукцыі.

У гэтых мэтах трэба перш за ўсё дабіцца рашучага пералому ў падняцьці працоўнай дысцыпліны ў калгасах, на падставе сапраўды сьвядомых адносін членаў калгасаў да сваіх абавязкаў, праводзячы пры гэтым прынцып адказнасьці за выкананьне даручанай работы і ствараючы асабістую матар'яльную зацікаўленасьць кожнага калгасьніка ў падняцьці прадукцыйнасьці працы (зьдзельная аплата працы, нармаваньне выпрацовак, сыстэма прэміяваньня і г. д.). Для павышэньня прадукцыйнасьці працы павінны быць усямерна скарыстаны мэтады сацыялістычнага спаборніцтва, разьвіцьця работы вытворчых нарад і шырокага разгортваньня самакрытыкі.

Істотным пытаньнем умацаваньня калгасаў зьяўляецца такая арганізацыя гаспадаркі, якая ў залежнасьці ад умоў раёну забясьпечыла-бы максымальнае скарыстаньне рабочай сілы калгасьнікаў (жывёлагадоўля, інтэнсыўныя культуры, падсобныя прадпрыемствы, саматужныя промыслы і г. д.). Кіруючыя органы калгасаў пры распрацоўцы арганізацыйных пляноў абавязкова павінны мець гэта на ўвазе.

6. Асаблівая ўвага партыі, саветаў, калгаснай сыстэмы павінна быць прыцягнута да праблемы **кадраў.** Калгасны рух прыняў такія разьмеры, якія патрабуюць рашучай рэвалюцыйнай перабудовы ўсяе сыстэмы, праграмы і мэтадаў падрыхтоўкі арганізатараў, агрономаў, інжынэраў, земляўпарадчыкаў, тэхнікаў, фінансава-рахункових работнікаў і г. д. для калгаснага будаўніцтва. Павінна быць забясьпечана рашучае павялічэньне ў новых прыёмах у вузы і тэхнікумы долі калгасьнікаў, асабліва з батракоў і беднаты.

Пленум ЦК прызнае неабходным арганізаваць пры Калгасцэнтры цэнтральную школу па падрыхтоўцы арганізатараў буйных калектыўных гаспадарак.

Побач з гэтым неабходна ў шырокім маштабе арганізаваць вывучэньне калгасных кадраў у саўгасах і буйных калгасах, якія павінны служыць масавай школай практыкаў - будаўнікоў буйное гаспадаркі, вывучыўшых на вопыце саўгасаў і калгасных работы ўжываньня найбольш дасканалых машын, новых форм арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасьці і працы, палепшаных агратэхнічных прыёмаў, скарыстаньне хэміі і г. д.

Магутным рэзэрвам, з якога павінны чарпацца кіруючыя кадры будаўнікоў сацыялістычнага земляробства, зьяўляюцца індустрыяльныя рабочыя. ЦК лічыць неабходным, акрамя сыстэматычнага ўзмацненьня калгаснага руху партыйнымі кіруючымі сіламі, накіраваць у вёску на працягу бліжэйшых месяцаў на работу ў калгасы, машына-трактарныя станцыі, куставыя аб'яднаньні і г. д. ня менш 25 тысяч рабочых з дастатковым арганізацыйна - палітычным вопытам. У падборы гэтых рабочых прафсаюзы павінны прыняць самы актыўны ўдзел, высоўваючы найбольш перадавых рабочых.

Калгаснае будаўніцтва немагчыма бяз узмоцненага падняцьця культурнасьці калгаснага насельніцтва. Савецкія органы, сама калгасная сыстэма, сель.-гасп. і спажывецкая каапэрацыя і ўся савецкая грамадзкасьць павінны разгарнуць шырокую работу па культурным абслугоўваньні калгаснага насельніцтва, у першую чаргу ў буйных калгасах, і ў раёнах масавай калектывізацыі. Узмацненьне дзейнасьці таварыстваў ліквідацыі няпісьменнасьці, бібліятэчнай справы, калгасных курсаў і рознага віду завочнага навучаньня, найбольшы ахоп школьнаю сеткаю дзяцей, узмацненьне культурнай і палітычнай работы сярод жанчын, шырокае разгортваньне школ сялянскай моладзі, масавае распаўсюджваньне агранамічных ведаў, паляпшэньне сацыяльна-бытавога абслугоўваньня калгаснага насельніцтва, асабліва жанчын (наладжваньне ясьляў, грамадзкае харчаваньне і інш.) — зьяўляюцца неабходнымі ўмовамі для пасьпяховага разьвіцьця калгаснага будаўніцтва. Асабліва важна таксама стварэньне пры мясцовых пунктовых машынна-трактарных станцыях культурных цэнтраў. Самы актыўны ўдзел у гэтай рабоце павінна прыняць спажывецкая каапэрацыя. Асабліва ўвага павінна быць аддана радыё і кіно, а таксама арганізацыі сродкаў сувязі (тэлефон, пошта) і разьвіцьцю дарожнага будаўніцтва ў калгасах. Значна павінна быць узмоцнена абслугоўваньне калгасаў з боку агульнага і спэцыяльнага друку.

(Працяг будзе).

А. ДУМС.

Далёка-Усходняя армія адказала моцным ударам на правакацыю кітайскіх белабандытаў

Разброена звыш 8000 кітайскіх салдат і 300 афіцэраў

ХАБАРАЎСК, 22. У першых чыслах лістапада кітайскае войска, якое знаходзіцца ў раёне Манчжуры і горада Шэйсан (на поўдзень ад Нярчынскага заводу, на рэчцы Аргуны) пачало сыстэматычна абстрэльваць артыперыйскім і кулямётным агнём і з вінтовак нашы пагранічныя часьці і мірнае насельніцтва, якое пражывае ўздоўж кітайскае мяжы па рацэ Аргуні. У выніку гэтых абстрэлаў насельніцтва станіц прымушана было спыніць абмалотку сабранага хлеба і эвакуавацца. Сярод насельніцтва гэтых станіц ёсьць забітыя і параненыя. Аднак, кітайскае войска гэтым не абмежавалася.

Пачынаючы з 13-га лістапада г. г. кітайскае камандваньне ўзмоцнена пераправіла на нашу тэрыторыю белагвардзейскія атрады, сфармаваныя імі ў раёне Трохрэчча. Захопленыя намі белагвардзейцы паказваюць, што яны атрымалі заданьне разбураць нашы тылы.

15-га лістапада кітайскае войска ў раёне разьезду № 86 сіламі белага батальёну прабавала перайсьці ў наступленьне. Наступленьне было адбіта агнём нашых пагранічнікаў.

У ноч з 17-га на 18-ае лістапада кітайскае войска пры падрымзньні артыперы перайшло ў наступленьне на станцыю Абагайтуеўскую і разьезд № 86. Правакацыйныя дзеяньні кітайскага войска за гэты час мелі месца ня толькі ў Забайкальі, але і ў Прымор'і ў выглядзе абстрэлу нашых пагранічнікаў і мірнага насельніцтва ў раёне Палтаўскай, Пагранічнай і Тур'яга Рогу, пачынаючы з 10-га лістапада прымусілі мірнае насельніцтва ў пагранічнай паласе кінуць папявыя работы і эвакуавацца.

Адначасова з гэтым пачасьціліся выпадкі пераходу на нашу тэрыторыю белагвардзейскіх банд з раёну Мішаньфу, які зьяўляецца месцам фармаваньня белагвардзейцаў для дзеяньняў у нашым тыле. Пачынаючы з 15-га лістапада кітайскае камандваньне ўзмоцнена перакідае сваё войска на станцыю Пагранічная і Мішаньфу. З гэтага-ж чысла кітайскае войска сіламі батальёну безвынікова прабавала перайсьці ў наступленьне ў раёне станцыі Пагранічная.

Раніцаю 17-га лістапада кітайская конніца перайшла нашу граніцу ў раёне Тур'і Рог і пасёлку Першамайскага і напала на нашы пагранічныя часьці.

Падлічаючы створаную на Далёкім Усходзе абстаноўку камандваньне Асобае Далёка-Ўсходняе армії павінна было прыняць з свайго боку контр-меры да абароны нашых граніц і для забясьпячэньня аховы пагранічнага насельніцтва і нашага тылу. У выніку, часьці Асобнае Далёка-Ўсходняе армії як у Забайкаліі, так і ў Прымор'і, адбіўшы 17-га лістапада наступленьне кітайскіх войск, прасьледзілі іх і на кітайскай тэрыторыі, адагнаўшы іх далей ад нашых граніц. Разброена звыш 8.000 кітайскіх салдат і 300 афіцэраў; адабрана да 10.000 вінтовак, значная колькасьць палявых пушак, агняпрыпасаў і іншае баявое амуніцыі

ПАСТАНОВА ЦВК СССР

аб савецкіх грамадзянах--перабежчыках у лягер ворагаў рабочае клясы

МАСКВА, 22. 21-га лістапада ЦВК СССР ухваліў наступную пастанову:

1) адмаўленьне грамадзяніна СССР—службовай асобы дзяржустановы або прадпрыемства СССР, які дзейнічае за граніцай, на прапанову органаў дзяржаўнай улады вярнуцца ў СССР, разглядаць, як перабежку ў лягер ворагаў рабочае клясы і сялянства і кваліфікаваць, як здраду.

2) Асобы, якія адмовіліся вярнуцца ў СССР, абвяшчаюцца па-за законам.

3) Абвяшчэньне па-за законам цягне за сабой: канфіскацыю ўсёй маемасьці асуджанага, расстрал асуджанага праз 24 гадзіны пасьля ўстанаўленьня яго асобы.

4) Усе такія справы разглядаюцца Вярхоўным Судом СССР.

5) Прозьвішчы абвешчаных па-за законам падлягаюць паведамленьню ўсім выканкомам саветаў і органам ДПУ.

Гэты закон мае зваротную сілу.

ПОЛЬСКІ ПРЭМ'ЕР СЬВІТАЛЬСКІ ПАГРАЖАЕ СОЙМУ

ВАРШАВА, 20. Польскі прэм'ер Сьвітальскі выступіў учора з публічным дакладам на тэму **аб неабходнасьці перагляду канстытуцыі.**

У сувязі з напружанай палітычнай абстаноўкаю, выступленьне Сьвітальскага чакалася з вялізарнаю зацікаўленасьцю. Галоўным арганізатарам дакладу быў палкоўнік Славэк, які спэцыяльна падабраў аўдыторыю. Білеты выдаваліся толькі яўным прыхільнікам ураду. Прадстаўнікі апазыцыі білетаў не атрымалі. Поўнасьцю была прадстаўлена замежная прэса.

Амаль паўтарагадзінны даклад Сьвітальскага, ня гледзячы на «прыяцельскую аўдыторыю», зрабіў надзвычайна слабае ўражаньне. Доўгую частку дакладу Сьвітальскі прысьвяціў крытыцы сойму, які «імкнецца ўхіліцца ад перагляду канстытуцыі». Толькі ў заключнай частцы прамовы Сьвітальскі высунуў тэзісы, якія прадстаўляюць значную палітычную цікавасьць. Тэзісы гэтыя ў асноўным зводзяцца да наступнага.

Ужо **хаця-б палітычна-геаграфічнае палажэньне Польшчы патрабуе стварэньня моцнай улады.** Але мова ідзе ня толькі аб вайне, але аб палітычных і гаспадарчых бурах. У момант навальніцы і буры Польшчы павінен быць забясьпечаны моцны і незалежны ад партыйных хістаньняў урад. Стварэньне парляманцкай большасьці, якая магла-б зьмяняўся кожныя паўгода, зьяўляецца ў Польшчы немагчымым. У самым ідэальным выпадку ў Польскім сойме ўсё роўна будуць існаваць тры лягеры —правы, левы і лягер нацыянальных меншасьцяй. Зьвяртацца-ж да падтрыманьня нацыянальных меншасьцяй, прадстаўнікі якіх займаюць анты-дзяржаўныя пазыцыі, было-б самым небясьпечным крокам. Наогул **пры даных польскіх умовах кожны ўрад вымушан жыць у атмасфэры бясьперапыннага пазітычнага шантажу.** Перагляд канстытуцыі зьяўляецца бязумоўнай неабходнасьцю. Ад гэтага залежаць сілы і будучыня дзяржавы. Зьмяняць лад у момант палітычных і гаспадарчых бур быў-бы надзвычайна рызыкоўнай апэрацыяй. Гэта неабходна зрабіць цяпер. Урад хацеў-бы, каб барацьба за рэвізію канстытуцыі адбывалася без патрасеньняў і на магчыма больш абмежаванай арэне. Вырашэньне задачы зьмены ладу можа адбыцца без патрасеньняў, калі асноўны тэзіс ураду—узмацненьне сілы дзяржавы шляхам стварэньня моцнага і трывалага ўраду—будзе прызнаны ўсімі. На сваім шляху ўрад, аднак, спатыкае ўпартасьць і сьвядомую абструкцыю і ня віна ўраду, калі барацьба за канстытуцыю будзе адбывацца на больш шырокім фронце. Ва ўсякім выпадку, урад не адмовіцца ад рэвізіі канстытуцыі толькі таму, што супроць яго выступае арытмэтычная большасьць сойму.

У заключэньне Сьвітальскі падкрэсьліў, што лягер пілсудчыкаў у сваёй барацьбе за ўказаныя вышэй задачы накіроўваецца і падтрымліваецца правадыром народу—маршалам Пілсудзкім. «Пілсудз

За далейшае разгортванне беларусізацыі, за ўздым яе якасьці

Пастанова Бюро ЦК аб становішчы беларусізацыі моцна стукнула па тых, хто, «галасуючы» за беларусізацыю, у сваёй канкрэтнай рабоце фактычна зрывае беларусізацыю, а ў «лепшым выпадку» «пасыўна» ёй супраціўляюцца. Рупацыны, «супраціўленцы» атрымалі яшчэ адзін довад таго, што партыя ня дурнае з імі жартаваць. А нацыянал-дэмакратам, гэтым «расійскім шавіністым павыварат» застаецца павар'яцець ад моцнага ўдару партыі па тых, хто дурнае сарваць лінію партыі ў галіне беларусізацыі. Нацыянал-дэмакраты бясконца ня любяць, калі партыя б'е па тых, хто зрывае беларусізацыю, бо такія ўдары кожны раз пановаму паказваюць на непрымірымасьць лініі партыі ў барацьбе з усялякімі нацыяналізмамі і адступленьнямі ад лініі партыі ў нацыянальным пытаньні.

Для нас ясны асноўны вывад з пастановы Бюро ЦК. Трэба ўпарта і сыстэматычна дамагацца поўнага ажыцьцяўленьня лініі партыі па пытаньнях беларусізацыі. Пра некаторыя новыя задачы і бакі барацьбы я і хачу сказаць у разьвіцьцё таго, што мною было напісана ў папярэдніх артыкулах.

Перш за ўсё аб разгортваньні беларусізацыі на прадпрыемствах. Для таго, каб стварыць належны пералом у разгортваньні беларусізацыі на прадпрыемствах, сярод рабочых, для таго, каб забясьпечыць посьпех ва ўсёй гэтай рабоце, уся работа па разгортваньні беларусізацыі павінна праводзіцца праз рабочых, пры дапамозе шырокіх мас рабочых, у першую чаргу — перадавых асноўных кадраў рабочых усіх нацыянальнасьцяй. Трэба стварыць ударныя групы, брыгады рабочых у добраахвотным парадку, якія павінны, папершае, самі аўладаць беларускаю моваю, падругое, узяць на сябе клопат па ўкараненьні беларускае мовы, азнаёміць з беларускай культурай усіх іншых рабочых. Усе гэтыя ўдарныя групы павінны сыстэматычна дапамагаць партыі, савецкім органам, прафсаюзам, правяраць, кантраляваць, як выконваюцца задачы партыі ў галіне беларусізацыі і як канкрэтна праводзіцца палітыка партыі на даным прадпрыемстве і ў розных арганізацыях і ўстановах. Што датычыць устаноў, то там трэба зрабіць тое самае. Калектывы супрацоўнікаў устаноў у асобе сваіх ударных груп і брыгад таксама павінны дапамагчы партыі правяраць, сыстэматычна сачыць і кантраляваць, як ажыцьцяўляюцца дырэктывы па пытаньнях беларусізацыі і ўсёй нацыянальнай палітыкі ў сваіх установах (акрамя гэтых задач, на ўсе брыгады будуць ускладзены яшчэ іншыя спэцыяльныя задачы, якія вынікаюць з другой часткі гэтага артыкулу — аб уздыме якасьці беларусізацыі). З калектываў устаноў, якія першымі павінны выступіць за разгортваньне беларусізацыі, зьяўляюцца калектывы ЦСУ, Лесбелу, Саюзхлеба. Яны павінны зразумець, што і яны пінаваты за дрэннае становішча беларусізацыі ў іх установах. Да ўсяго гэтага трэба дадаць, што нашы нацыянальныя камісіі павінны быць папоўнены рабочымі і гэтыя рабочыя брыгады і ударныя групы і брыгады павінны складаць той актыў нацкамісій, з дапамогаю якога яны і абавязаны разгортваць і ажыцьцяўляць свае задачы. Зразумела, што асноўныя кадры з ударных груп і брыгад з устаноў таксама павінны быць выкарыстаны для гэтай мэты.

Вельмі карысна будзе, калі рабочыя ўдарныя брыгады і групы і ўдарныя брыгады з служачых свае заданьне і свае абавязкі па вывучэньні беларускай мовы, па разгортваньні беларусізацыі на сваіх прадпрыемствах і ўстановах аформяць у выглядзе дагавору.

Трэба арганізаваць спаборніцтва на лепшае і хутчэйшае правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў партыі аб беларусізацыі і па нацпытаньні цалкам.

Гаворачы аб разгортваньні беларусізацыі, мы да гэтага часу мелі на ўвазе галоўным чынам папярэньне базы беларусізацыі, павялічэньне аб'ёму беларусізацыі за кошт рабочых. Мы пастараліся ўгрунтаваць гэта палітычна, мы прапанавалі некаторыя канкрэтныя арганізацыйныя формы для вырашэньня гэтай задачы. Побач з гэтым, перад намі стаіць яшчэ адна найважнейшая задача ў галіне беларусізацыі, якая хоць і цесна зьвязана з першай задачай, але ўсё-ж павінна быць пастаўлена, як самастойная, канкрэтная праблема, — гэта ўздым якасьці беларусізацыі.

У галіне беларусізацыі, развіцьця беларускай культуры ў нас ёсьць вялікія дасягненьні ня толькі якаснага парадку, але і колькаснага. Досыць толькі ўспомніць аб магутным разьвіцьці ўсіх форм і відаў беларускай «духоўнай» культуры, пачынаючы з мовы, якая ўзбагацілася на тысячы новых слоў, і канчаючы ўсімі відамі мастацтва. Мы ўжо не гаворым аб матар'яльнай культуры, дзе мы змаглі атрымаць вялізэрныя посьпехі, дзе кіруючым пачаткам зьяўляецца сацыялістычны сэктар нашай гаспадаркі. Аднак, у нас ёсьць хібы і недахопы, на некаторых з іх трэба спыніцца.

Аб разгаворнай мове. Ёсьць рад выпадкаў, калі тая мова, якая выдаецца за беларускую, толькі ў пязначнай ступені падобна на сапраўдную беларускую мову. У іншай гутарцы, у іншай размове столькі пакалечаных беларускіх слоў і столькі небеларускіх слоў, што проста сорам за тых, хто, ужываючы іх, лічыць, што гаворыць па-беларуску.

Зусім зразумела, што засьмечанасьць, няправільнае вымаўленьне беларускіх слоў зьяўляецца няўхільным у працэсе азнаямленьня і вывучэньня мовы і практычнага трэнаваньня для аўладаньня ёю. Лепш усё-ж гаварыць першы час на ломанай беларускай мове, каб гэтым самым паступова вывучыць яе дасканала, чым сароміцца гэтае пакалечанае мовы, ня ўжываць яе ў практычнай рабоце і тым самым затармазіць пасьпяховае аўладаньне ёю. Як-ні-як, у пачатку, пры вывучэньні беларускай мовы тымі, хто ня ведае яе, будуць няправільна вымаўляцца паасобныя словы. Гэта ўсё для нас зразумела, але ўсё такі нам трэба завастрыць увагу на праблеме паляпшэньня якасьці мовы, на якой мы гаворым. Час паставіць, як чарговую задачу, пытаньне аб паляпшэньні якасьці мовы, трэба пераходзіць на не пакалечаную беларускую мову. Гэту задачу мы маем права паставіць, мы абавязаны яе паставіць таму, што большая частка скажэньняў у разгаворнай беларускай мове ва многіх зьяўляецца не таму, што яны ня могуць аўладаць поўнасьцю беларускай мовай, навучыцца гаварыць на ёй, а таму, што такія асобы вельмі часта праяўляюць нядбайнасьць, няўважлівыя адносіны да якасьці, да чыстаты мовы, на якой ім прыходзіцца гаварыць, якую яны ўжываюць у сваёй штодзённай практычнай рабоце. Вось чаму многія таварышы і гаворачь на дрэнным беларускай мове. Яны не пакланаціліся зьвярнуць на гэта сур'ёзную ўвагу і не зрабілі ўсіх захадаў да таго, каб палепшыць якасьць сваёй мовы. Трэба павесьці рашучую барацьбу супроць нядбайных адносін да беларускае мовы.

Пытаньне аб лепшым вывучэньні беларускае мовы мае сувязь яшчэ з наступнай задачай. Барацьба за лепшае вывучэньне, за паляпшэньне якасьці беларускае мовы зьявіцца моцным штуршком для тых, хто пачаў вывучаць беларускую мову, але ня скончыў яе вывучэньня. Трэба ўзяць рашучы курс на поўнае вывучэньне беларускае мовы тымі, хто пачаў яе вывучаць, наватаў здаў экзамэн і як быццам павінен быў яе ведаць. У жыцьці справа стаіць так, што многія з тых, хто лічыць, што ён ведае мову, на справе ведае яе дрэнна. А Ці-ж працуюць яны над сабою, ці стараюцца павялічыць свае веды ў галіне беларускае мовы? На жаль, такія выпадкі рэдкія.

Такім чынам, перад намі стаіць задача дамагацца лепшага вывучэньня беларускае мовы ня толькі тымі, хто яе зусім ня ведае, але і тымі, хто яе ведае кепска, не даволі. Патрабаваньне аб паляпшэньні ведаў беларускае мовы адносіцца ў першую чаргу да тых, хто яе ведаць абавязан, у тым ліку і да ўсіх лектароў, агітатараў, прапагандыстых і інструктароў.

Побач з паляпшэньнем якасьці беларускае мовы ў гутарцы, пры дакладах, на лекцыях трэба паставіць пытаньне аб павышэньні якасьці мовы нашых газэт і часопісяй. Мова ва многіх газэтах і часопісях мае рад граматычных і стылістычных хібаў. Усе гэтыя хібы залежаць і ад таго, што ў нас мала людзей, якія добра ведаюць беларускую мову, і ад нашай няўважлівасьці, ад нашай нядбайнасьці да гэтага пытаньня. З усімі гэтымі ненармальнымі зьявішчамі час пакончыць. І сапраўды, па нашых-жа газэтах і часопісях многія вучацца беларускай мове. Трэба наладзіць кампэтэнтны, сыстэматычны агляд друку, як пэрыядычнага, так і непэрыядычнага з пункту погляду якасьці мовы і з вынікамі гэтых аглядаў сыстэматычна азнаямляць аўтараў, карэктароў, выдаўцоў і, галоўнае, чытачоў. Такія агляды дадуць вялікую карысьць і выкладчыкам беларускае мовы. Такія агляды дапамогуць хутчэй выправіць усе хібы і няправільнасьці пры ўжываньні беларускае мовы, дапамогуць яе агульнаму разьвіцьцю. Такія агляды будуць перасьцерагаць нас ад далейшых памылак і падштурхнуць многіх больш дасканала вывучаць беларускую мову. Урэшце, такія агляды прымусяць многіх больш уважліва адносіцца да якасьці мовы.

Далейшае разгортваньне працэсу беларусізацыі і ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі нашай партыі, узмацненьне працэсу аўладаньня беларускай мовай, барацьба за якасьць беларусізацыі абавязвае нас разгарнуць палітычнае ўгрунтаваньне гэтых мерапрыемстваў. Палітычны зьмест гэтага вельмі важны. Трэба пытаньні разгортваньня беларусізацыі, пытаньні ажыцьцяўленьня нацпалітыкі партыі на практыцы насыціць палітычным зьместам. Уся гэта работа павінна быць выкарыстана для папулярызацыі нацпалітыкі партыі, барацьбы партыі з усялякімі нацыяналізмамі, для ацэнкі нашых колькасных дасягненьняў, праверкі таго, што зроблена ў прапрацоўцы разам з масамі, таго, што яшчэ трэба зрабіць. Праца па разгортваньні беларусізацыі на прадпрыемствах, паляпшэньне якасьці беларусізацыі цалкам павінна быць забясьпечана арганізацыйна і тэхнічна. Трэба даць настаўнікаў, падручнікі, трэба адшукаць сродкі. Дзяржава ня зможа патраціць на гэта вялікія сродкі, але сёе-тое трэба будзе даць. Рэштку сродкаў, пераважную частку сродкаў трэба адшукаць на мясцох і часткова праводзіць за кошт саміх асоб, якія вывучаюць мову. Акрамя таго, трэба арганізаваць сыстэматычную дапамогу тым, хто хоча, хто абавязаны павысіць свае веды ў галіне беларускае мовы.

І гэта задача вельмі важная. Трудна адшукаць настаўніка, падручнікі, але яшчэ цяжэй, для многіх, вельмі часта зусім немагчыма атрымаць кампэтэнтную параду, добрае ўказаньне па пытаньнях, зьвязаных як з вывучэньнем беларускае мовы, так і з якасьцю тэй мовы, якою карыстаюцца. Для таго, каб зьнішчыць і гэту вельмі сур'ёзную перашкоду, трэба наладзіць кансультацыі па пытаньнях вывучэньня, праверкі ведаў у галіне беларускае мовы, прагляду заданьняў, артыкулаў і г. д. Акрамя таго, гэтыя кансультацыі павінны дапамагчы адшукаць добрага настаўніка і магчыма арганізаваць заочнае і групавое навучаньне беларускай мове. Патрэба ў такіх кансультацыях і цяпер вялікая. А калі мы прыступім да выкананьня ўсіх гэтых задач, то без такіх кансультацый і зусім цяжка будзе абыйсьціся.

Павядзем-жа барацьбу за далейшае разгортваньне беларусізацыі, за ўздым якасьці беларусізацыі, за яшчэ лепшае правядзеньне ў жыцьцё, на практыцы дырэктыў партыі ў галіне беларусізацыі і нацпалітыкі цалкам.

А. ТАНХІЛЕВІЧ.

ГЕНЭРАЛЬНАЯ ЧЫСТКА ПАРТЫІ

Праверка вызваляе рады бальшавікоў ад сацыяльна чужых элемэнтаў і ад апартуністых, якія парываюць з генэральнай лініяй УсеКП(б)

Сваячасова выправіць памылкі ў працэсе чысткі

Шырэй разгарнуць самакрытыку.—Сьмялей выяўляць факты бюракратызму

Некаторыя вывады і заўвагі з практыкі чысткі

Праверка і чыстка савецкіх ячэек у самым разгары. Частка ячэек прайшла чыстку, і мы можам ужо зрабіць некаторыя папярэднія вывады. Мы можам таксама выкарыстаць практыку для далейшай праверкі.

Наогул арганізацыя была досыць мабілізавана і падрыхтавана да генэральнай чысткі. Праверка выявіла, як ячэйкі і асобныя камуністыя праводзяць генэральную лінію партыі, як яны ўцямілі сутнасьць і карэньні правага ўхілу, як ячэйкі і асобныя камуністыя вялі барацьбу з права-апартуністычнай практыкай і нацыянал-дэмакратызмам. Аб тым, што праверка праходзіла іменна пад знакам выкананьня пастаноў партыі, сьведчыць чыстка такіх ячэек, як Наркамасьветы, Наркамзем, акрза, Акрфа, Белдзяжстрах і інш.

Уся Менская арганізацыя хутка і пабальшавіцку рэагавала на вылазкі нацыянал-дэмакратаў у часе чысткі. Орган ЦК КП(б)Б—«Зьвязда», сваячасова завастрыла ўвагу перад партыйнай арганізацыяй вакол гэтых пытаньняў.

Трэба адзначыць, што практыка прымацаваньня вытворчых ячэек, а таксама рабочых партыйных брыгад да савецкіх ячэек, ня гледзячы на паасобныя дэфэкты, сябе апраўдала. Брыгады дапамаглі праверкомам завастрыць увагу вакол важнейшых пытаньняў работы ячэйкі і ўстановы.

Аднак, побач з дадатнымі бакамі, трэба адзначыць цэлы рад недахопаў у праверцы і чыстцы. Рад ячэек да пачатку чысткі аказаліся непадрыхтаванымі, а ў некаторых ячэйках на праверачных сходах ня было зусім беспартыйных і праверкомам прыходзілася адкладваць сходы (Наркамзем, акрза, Наркамгандаль і інш.).

Асобныя бюро ячэек абмяжоўваліся толькі справаздачамі на праверачных сходах і зусім не адчувалася ў часе персанальнай праверкі. Ня ўсюды досыць шырока была разгорнута самакрытыка—назіраліся выпадкі аховы «гонару мундзіру», выпадкі кругавой парукі сярод камуністых і боязьні крытыкаваць з боку беспартыйных. У асобных ячэйках некаторыя камуністыя разважалі: «Як-жа мы будзе гаварыць аб усім пры беспартыйных, гэта-ж падарве аўтарытэт установы». Гэтыя таварышы зусім не разумеюць пэзунгу самакрытыкі. Былі выпадкі, калі асобныя камуністыя прабавалі скампрамэтаваць праверкомы (нарсувязь, Белжылсаюз). Але гэтыя таварышы атрымалі адпор з боку ячэек.

Зусім нездавальняючыя вынікі мы маем у адносінах выяўленьня фактаў бюракратызму. Тут трэба біць трывогу. З прычыны недастатковага разгортваньня самакрытыкі ў радзе ячэек, факты бюракратызму ва ўстановах застаюцца ня выяўленымі. Праверкомы і ячэйкі павінны завастрыць на гэтым сваю ўвагу.

У некаторых ячэйках пры персанальнай праверцы былі выпадкі каканьня ў дробязях быту камуністых. Вось некаторыя факты: на праверачных сходах калектыву Камвузу камуністым задаваліся такія пытаньні: «Як гэта бацька ваш памёр глыбокім старыком, а за два гады да гэтага ажаніўся?», «Чаму ты ў часе адпачынку ў Жданавічах піў па шклянкі мапака». «Колькі грошай у цябе ў ашчаднай касе, толькі праўду кажы?», «Табе 35 год, чаму ты ня жэнішся» і г. д. Можна было-б памножыць гэтыя факты анэкдатычных запытаньняў, якія задаваліся правераным таварышом і якія фактычна былі накіраваны да зрыву праверкі.

Ясна, што такія запытаньні адцягваюць увагу ад высьвятленьня палітычнага твару таварыша, што праходзіць праверку, ці здолен ён выразна праводзіць лінію партыі.

ЦКК УсеКП(б) адзначыла дрэнны ўдзел камсамолу ў праверцы і чыстцы партыі. І наша камсамольская арганізацыя таксама не зьяўляецца выключэньнем. Камсамол прымае слабы ўдзел у праверачных сходах і мала дапамагае рабоце праверкомаў.

Мы пачалі ўжо праводзіць чыстку вытворчых ячэек КП(б)Б. Вытворчыя ячэйкі павінны завастрыць увагу на аднэй з галоўных задач—на ўзмацненьні вярбоўкі ў партыю лепшых перадавых рабочых. Трэба сказаць, што дагэтуль вярбоўка ў партыю не знаходзіцца яшчэ на належнай вышыні.

Праверачныя камісіі даюць багацейшыя вынікі і матар'ялы аб рабоце ячэек. Аднак, гэтыя матар'ялы ячэйкамі не выкарыстоўваюцца. Пасьля праверкі яны працягваюць сваю работу пастарому.

Між тым, галоўная задача праверачных ячэек—перабудаваць пасьля чысткі ўсю сваю работу, выкарыстаўшы ўсе вывады і матар'ялы праверкомаў.

Вось тыя некалькі заўваг, якія трэба зрабіць у ходзе чысткі для таго, каб улічыць іх у працэсе далейшай праверкі і ў рабоце ячэек.

Л. ГУРЭВІЧ.

На чыстцы ячэйкі міліцыі

Пачалася праверка і чыстка ячэйкі КП(б)Б міліцыі (Менск). Праверачныя сходы праходзяць пры актыўным удзеле партыйцаў і беспартыйных міліцыянэраў. У чыстцы прымаюць удзел таксама рабочыя-чыгуначнікі. На першым сходзе ў спрэчках па дакладу сакратара ячэйкі выступіў адзін міліцыянэр, які імкнуўся ўвесьці праверком у зман і сарваць праверку. Гэты таварыш, зьяўляючыся сам злосным парушыцелем працдысцыпліны, зусім беспадстаўна абвінаваціў асобных партыйцаў у заціску самакрытыкі. Але ён атрымаў самы рашучы адпор з боку міліцыянэраў.

Ячэйка працуе ў складаных умовах. Сярод усёй масы міліцыянэраў толькі 10 проц. партыйцаў.

У органах міліцыі наглядаюцца выпадкі бюракратызму і цягаціны. Адно з аддзяленьняў міліцыі выдала пашпарт нейкай грамадзянцы бяз подпісу і пячаткі. Толькі праз год, калі гэты пашпарт зноў трапіў у аддзяленьне для заяўкі, гэта «памылка» была выкрыта. Быў выпадак, калі заметка селькора, прысланая рэдакцыяй у міліцыю для расьсьледваньня, была накіравана акруговым адмадзелам у раён таму міліцыянэру, аб якім пісаў селькор. Ячэйка слаба рэагавала на выпадкі скрыўленьня клясавай лініі ў практыцы міліцыі. Сакратар ячэйкі ў сваім дакладзе нават не закрануў гэтага пытаньня, мабыць, таму, што няма чым паганярыцца. Партячэйка слаба кіруе работай сярод жанчын, а таксама ячэйкай ЛКСМВ.

В. БАЛЬЗОЎСКІ.

Правяраем свае рады і работу

Работа праверкому па чыстцы партколектыву Камуністычнага унівэрсытэту імя У. І. Леніна пачалася з шырокага абмеркаваньня справаздачы бюро калектыву.

Па дакладу выступіла шмат таварышоў. Спрэчкі прайшлі пры шырокім разгортваньні крытыкі, ня гледзячы на асобы. Але трэба адначаць, што некаторыя выступленьні грунтаваліся на глебе асабістых спраў і разрахункаў. Гэтыя выступленьні сустралі аднадушны адпор з боку партыйнага калектыву.

За апошнія гады парткалектыў правёў вялікую работу па камуністычным выхаваньні студэнцкіх мас і барацьбе з правымі правага апартунізму і прымірэнцтва, з «левымі» наскокамі на лінію партыі. Калектыў сваячасова рэагаваў на контр-рэвалюцыйную двейнасьць трацкізму і даў рашучы адпор тым таварышам, якія хісталіся пры выключэньні Троцкага з партыі і ўстрымаліся ад галасаваньня за выключэньне. Большая частка з гэтых таварышоў хутка прызнала свае памылкі.

За апошні час бюро і калектыў цалкам разгарнулі рашучую барацьбу з правым ухілам і прымірэнцтвам да яго. Нельга не адначаць, што бюро партыйнага калектыву крыху спазьнілася з пастаноўкай пытаньня аб дасканальным выключэньні сутнасьці карэньняў правага ўхілу.

Калектыў несвалачасова прапанаваў пытаньне аб канкрэтных праявах правага ўхілу ва ўмовах Беларусі. Ня было спэцыяльнага абмеркаваньня права - апартуністычнай палітыкі Наркамзему, пытаньняў барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам і скажэньняў лініі партыі ў практыцы Наркамасьветы. З боку некаторых партыйцаў ня было належнага разуменьня сутнасьці правага ўхілу. Гэта прывяло да таго, што ў насьценгазэце быў зьмешчаны артыкул, у якім хуліганскія ўчынкі кваліфікаваліся, як праявы правага ўхілу (артыкул Іцкова).

Унутрыпартыйная дэмакратыя і самакрытыка да восені 1928 году ня былі разгорнуты. Ня было шырокага абмеркаваньня асноўных пытаньняў аб крытыцы і самакрытыцы. У выніку бюро неяк асьцярожна адносілася да ініцыятывы партыйнай масы. Рэдкалегія насьценгазэты назначалася. Бюро калектыву правярала заметкі, а часамі іх зусім не дазваляла зьмяшчаць. У склад бюро калектыву і графкому таварышы рэкамэндаваліся на гатовым сьпісе.

Пачынаючы з 1929 г у разгортваньні самакрытыкі наступіў злыбокі пералом, які дапамог калектыву выправіць хібы і недахопы ў рабоце.

З недахопаў трэба адзначыць адсутнасьць выразнай сыстэмы па партвыхаваньні членаў калектыву. Таксама ёсьць яшчэ вялікія недахопы ў падрыхтоўцы новых кадраў да паступленьня ва унівэрсытэт. Калектыў уступіў у сацыялістычнае спаборніцтва, але праверка выкананьня сацыялістычнага дагавору яшчэ не праведзена.

Наогул, парткалектыў у сваёй асноўнай масе зьяўляецца здаровым і ідэалёгічна вытрыманым. Шырокае разгортваньне самакрытыкі на праверачных сходах дапамагае праверкому і калектыву выкрыць тых, хто прымазаўся да партыі і не апраўдаў годнасьці камуністага.

А. Ф.
Х. Н.
Г. У.

ПАПРАЎКІ

У апошнім абзацы заметкі «Копыскія прарывы» («Зьвязда» 13-XI) замест слоў: «АК і АКК адмовіліся распусьціць Копыскі РК КП(б)Б», трэба чытаць: «Тав. Гніленевіч у гутарцы з тав. Сьвірыдавым выказаў думку аб патрэбнасьці распусьціць Копыскі РК КП(б)Б. Але гэтае пытаньне дагэтуль нідзе не абгаворвалася».

***

Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» ў пастанове бюро Кастрычніцкага райкому КП(б)Б аб выказцы Кузьміцкага пры надрукаваньні ўкралася прыкрая агідная памылка. Апошнія чатыры радкі 3-га абзацу трэба чытаць так: «... так і па пытаньні тэмпаў калектывізацыі сельскай гаспадаркі індустрыялізацыі краіны і наступленьня на КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ элемэнты».

Самакрытыка яшчэ не разгорнута

Аб'яднаны пленум Віцебскага АК і АКК КП(б)Б ухваліў рад канкрэтных пастаноў па далейшым разгортваньні крытыкі і самакрытыкі ў Віцебскай акруговай арганізацыі і даў выразныя дырэктывы аб разгортваньні самакрытыкі. Між тым, факты жыцьця нізавых партыйных арганізацый сьведчаць аб тым, што гэтыя пастановы не знайшлі практычнага адлюстраваньня ў практыцы асобных арганізацый акругі. Чым інакш можна вытлумачыць паводзіны партыйцаў ячэйкі Сампрамсаюзу, якія ў адказ на здаровую правільную крытыку з боку беспартыйных рабочых абазывалі апошніх бузацёрамі, награжалі ім звальненьнем з работы і г. д.

На фабрыцы акупляраў бюро партячэйкі кантралюе рабкораўскія заметкі. Заціск самакрытыкі дайшоў да таго, што бюро партыйнай ячэйкі патрабавала, каб рэдкалегія ўзгадняла з бюро ўвесь выкрываючы матар'ял і паведамляла бюро прозьвішчы рабкораў. Пры такім становішчы работа насьценгазэты заняпала. Газэта не карыстаецца ніякім аўтарытэтам сярод рабочых і ніхто ў яе ня піша. Сакратар Рутковўскай ячэйкі КП(б)Б (Віцебскі раён) Шалухоўскі ў прысутнасьці беднаты і серадняцтва сарваў артыкул у насьценгазэце, у якім крытыкаваліся яго антыпартыйныя ўчынкі. Падамо яшчэ больш яскравыя факты заціску самакрытыкі. Ужо ў трэці раз распусклецца мясцком лазьняў Віцебскага камунальнага трэсту. У лазьнях ужо тры гады, як робяцца розныя злоўжываньні і агідныя абураючыя ўчынкі. Калі хто-небудзь з работніц пратаставаў супроць злачынстваў, якія тварыліся ў лазьнях, дык гэту работніцу звальнялі з работы. Тут мелі месца поўны заціск самакрытыкі, сямейныя сходы на кватэры «начальства», дзе за чаркай гарэлкі абмяркоўваліся «праекты» расправы з крытыкамі.

У Віцебскай арганізацыі ўжо мелі месца прарывы ў разгортваньні самакрытыкі і крытыкі (справа газэты «Заря Запада», пры вырашэньні якое бюро АК і прэзыдыум АКК дапусьцілі грубыя палітычныя памылкі). Да рэчы, пытаньне аб гэтых прарывах было абмеркавана толькі на пленуме АК і АКК, на актыве і... усё. А дзе думка нізавых партыйных арганізацый? Чаму гэта пытаньне ня было абмеркавана на сходах партыйных ячэек? Чаму, нарэшце, мясцовая газэта абмежавалася толькі тым, што перадрукавала частаноў ЦККК, не разгарнуўшы належнага асьвятленьня на сваіх старонках уроку віцебскіх спраў? Нам здаецца, што гэты сур'ёзны недахоп трэба выправіць.

ВІЦЕБСКІ.

Прапаганда поглядаў правых несумяшчальна з прабываньнем у радах УсеКП(б)

За жалезную бальшавіцкую дысцыпліну

Заслухаўшы інфармацыю тав. Цёмкіна аб пастановах апошняга пленуму ЦК УсеКП(б), агульны сход ячэйкі КП(б)Б малога рамонту станцыі Менск пас. вітае бальшавіцкія пастановы пленуму.

Сход цалкам і поўнасьцю ўхваляе пастанову пленуму наконт групы правых ухілістых і лічыць зусім правільным вывад т. Бухарына са складу Палітбюро і апошняе папярэджаньне т. т. Томскаму і Рыкаву.

Сход патрабуе ад правых ухілістых поўнага прызнаньня сваіх апартуністычных памылак. Сход патрабуе ад ЦК УсеКП(б) ужыць рашучыя арганізацыйныя меры да правых апартуністых у выпадку найменшай спробы з іх боку парушыць пастановы апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) і працягваць фракцыйную барацьбу супроць лініі партыі і Камінтэрну.

Ячэйка КП(б)Б малога рамонту, шчыра вітаючы бальшавіцкі ЦК за яго непрымірымую барацьбу з усялякімі адхіленьнямі ад лініі партыі, запэўняе ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б у сваёй гатоўнасьці да канца змагацца з правымі капітулянтамі і прымірэнцамі, не паслабляючы барацьбы з левымі наскокамі на генэральную лінію партыі.

Няхай жыве адзінства Ленінскай партыі!

Няхай жыве ленінізм!

Пастанова бюро Аршанскага АК КП(б)Б

Бюро Аршанскага акруткому КП(б)Б поўнасьцю далучаецца да пастаноў лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб выводзе тав. Бухарына са складу палітбюро і аб папярэджаньні т. т. Рыкаву і Томскаму.

Бюро АК адзначае, што т. Бухарын у радзе сваіх твораў—«Шлях да сацыялізму», «Заметкі эканамістага», «Тэорыя арганізаванай бязгаспадарчасьці» і інш.—дае тэарытычнае афармленьне права-апартуністычнаму ўхілу.

Партыя за апошні час ня раз зварачалася да правай апазыцыі з прапановай спыніць фракцыйную дзейнасьць супроць партыі. Але правыя капітулянты, ня гледзячы на свае поўнае палітычнае банкруцтва, працягваюць фракцыйную работу супроць партыі.

Бюро АК заяўляе, што двурушніцтва, фракцыйная барацьба супроць партыі несумяшчальны з прабываньнем у радах камуністычнай партыі. Аршанская арганізацыя КП(б)Б вядзе і будзе весьці сваю работу пад знакам рашучай барацьбы на два франты, асабліва з правым ухілам і прымірэнцтвам да яго, як з найбольш небясьпечным у сучасны момант, адначасова не паслабляючы барацьбы з «левымі» наскокамі на лінію партыі. Бюро АК заклікае ўсю партыйную арганізацыю і падалей рашуча змагацца з антыпартыйнай дзейнасьцю правых капітулянтаў. Аршанская арганізацыя была і будзе цьвёрда стаяць на варце генэральнай лініі партыі. Няхай жыве Ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Чужы элемэнт--у працкалектыве „Адраджэньне“

12-га лістапада пачалася чыстка рабочых фабрыкі працкалектыву «Адраджэньне».

Чыстка мае на мэце пазбавіць фабрыку ад сацыяльна-чужога, шкоднага элемэнту. Ужо першы дзень чысткі выявіў асоб, якім зусім ня месца ў працкалектыве.

Вось некаторыя з іх.

На фабрыцы працуе дачка кулака, які абкладзены індывідуальным падаткам, Параска Каханоўская. Калі Параска падала заяву аб уступленьні ў ЛКСМ, і сакратар ячэйкі патрабаваў спраўкі аб сацыяльным становішчы, яна прадставіла хлусьлівую спраўку аб тым, што бацька яе зьяўляецца селяніном. Толькі лёгкая кавалерыя выкрыла сапраўдны сацыяльны твар Параскі Каханоўскай.

Яе браты і сёстры таксама пралезьлі на прадпрыемствы. Сястра служыць у працкалектыве «Утылізацыя», адзін брат у Меншвэі, адзін у краме № 21 МЦРК.

Другі з выкрытых—Смарадынскі—«рабкор». Ён у цэху займаўся склокамі, арганізоўваў групы, а потым пісаў пра іх у газэту «Рабочий», ён імкнуўся падарваць працдысцыпліну, хаваючы свой сапраўдны твар пад маскай актывістага. Бацька Смарадынскага меў сваю піўную, каўбасную майстэрню з наёмнымі рабочымі.

«Рабочы» Бляхер да 1921 г. меў сваю краму, тры ўласныя дамы з якіх адзін каменны. Рабочы Барысэвіч мае тры дамы, якія даюць 900 руб. прыбытку ў год: ён бярэ кватэрную плату з членаў ня згодна ставак, а па дагаворанасьці. Старэйшы брат яго паводле пастановы калегіі ДПУ асуджаны за шпіянаж ў напраўчы дом. Працуе ў працкалектыве былы сыны ніяшты Паспэр, які сядзеў у спраўдоме за сыяніцкую нелегальную работу.

На фабрыцы ёсьць шмат дзяцей ліпэнцаў, спэкулянтаў, домаўласьнікаў. Чыстка, бязумоўна, выкрые ўсіх іх, пазбавіць фабрыку ад шкоднага і непатрэбнага элемэнту і дасьць магчымасьць узьняць працдысцыпліну і якасьць прадукцыі.

Л. Б.

Л. Эвэнтаў

Легэнда аб арганізаваным капіталізьме*)

Якавы рэальныя, а не «лёгічныя» рысы ўнутранай структуры «арганізаванага капіталізму», і ў чым іх адрозьненне ад структуры «чыстага» капіталізму?

Па Зомбарту (гл. яго даклад «Судьбы капитализма» на зьезьдзе саюзу сацыяльнай палітыкі ў Цюрыху ў мінулым годзе аб. «Буржуазные ученые о закате капитализма») яны зводзяцца да наступнага: 1. Упала роля «здольнага прадпрыемцы», бо «расьце нахіл прадпрыемцы арганізаваць сваё прадпрыемства на навуковай аснове». 2. Зьмяншаецца імпэт да нажывы. 3. Адмерла «рынчная мэханіка і ня месца цяпер заняло рэгуляваньне картэлямі цэн, зарплаты і прыбыткаў, незалежна ад становішча на рынку. На сваёй празьмернай схільнасьці да сыстэматыкі. Зомбарт пералічвае яшчэ многа іншых асаблівасьцяй, але мы абмяжуемся сказанымі і разгледзім іх, як найбольш істотныя рысы.

Што датычыць паслабленьня ролі «здольнага прадпрыемцы», то наўрад ці варта на гэтым спыняцца. Адзначым толькі для характарыстыкі тэарытычнага ўзроўню сучасных буржуазных эканамістых, што Шумпэтэр, другое зьяўіла буржуазнай навукі, які працуе ў апошні час у прадпрыемчых арганізацыях, даводзіць у процівагу Зомбарту, што іменна адважныя прадпрыемцы і зьяўляюцца штурхачамі эканамічнага прагрэсу. Ці дзіўна пасьля гэтага, што прадпрыемцы запрашаюць яго з раскрытымі абнімкамі на свае зьезды і карыстаюцца яго вучонай кансультацыяй па «рабочым пытаньні»?

Па сутнасьці-ж адхіленьне прадпрымцы з вытворчага працэсу, пра што яшчэ казаў Маркс, і падвядзеньне навуковага фундаманту пад прадпрыемства сьведчыць аб рацыяналізацыі паасобнай клетачкі гаспадарчага цэлага, але ні ў якім разе не аб адміраньні анархіі вытворчасьці ўнутры грамадзкай сыстэмы.

Зьмяншэньне імпату да нажывы Зомбарт даводзіць дзівосным спосабам. Сымптомамі гэтага звалаcаблівага капіталістычнага «перараджэньня», паводле яго думкі, зьяўляецца фіксаваньне разьмераў дывідэндаў і інвэставаньне лішкаў прыбыткаў у прадпрыемстве, якое даходзіць у Злучаных Штатах да 30-35 проц. Гэта развага масьцітага «гэлертэр'а» проста зьдзіўляе. Можна падумаць, што капіталістыя інвэстуюць свае капіталы з добрачыннай мэтай і для выкананьня грамадзкага абавязку. Але Зомбарту, які займаецца вывучэньнем псыхалёгіі прадпрыемцы, варта было-б памятаць, што матаўство і раней не зьяўлялася асноўнай буржуазнай добрачыннасьцю. Аднак, указаньне Зомбарта цікава з другога боку. Тая акалічнасьць, што ўсё большая частка прыбыткаў павінна інвэставацца, сьведчыць аб тым, што разьмеры вытворчасьці растуць незалежна ад росту ёмістасьці рынку, і што маштабы капітальных укладаў, інакш кажучы, тэмп накапленьня навязваецца аб'ектыўным ходам рэчаў, якому, між іншым, павінны падпарадкавацца і манапалістычныя аб'яднаньні. Гэтым самым стварацца ўмовы для павялічэньня стыхійнасьці грамадзкага працэсу, г. зн. нешта проста супрацьлеглае арганізаванаму разгортваньню вытворчасьці.

Простым «очковтирательством» зьяўляецца спасылка на фіксаваньне дывідэндну. Папершае, фіксуецца дывідэндная стаўка, а не дывідэндная маса, значыць, прыбыткі аблігацыянэра працягваюць хістацца ў залежнасьці ад яго аблігацыйнага капіталу. З другога боку, прыбытак прадпрыемцы вызначаецца агульнай масай з прыбытку прадпрыемства. Таму сьмешна гаварыць аб стабілізу

ДЗЕНЬ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ НА СЭСІІ ЦВК

Клімаўшчына паведамляе сэсію аб сваіх вялікіх дасягненьнях

Да канца 1930 г. давядзем пасеўную плошчу аграмаджанага сэктару БССР да 20% усёй пасеўнай плошчы

Калектывізацыя ахапляе цэлыя вёскі, сельсаветы і раёны

З дакладу т. Рачыцкага

На ранішнім пасяджэньні 22-га лістапада народны камісар зямляробства БССР тав. Рачыцкі выступіў з вялікім дакладам аб калгасным будаўніцтве ў БССР.

— Пасьля XII-га зьезду КП(б)В, — кажа тав. Рачыцкі, — калгаснае будаўніцтва набыло зусім новыя формы свайго разьвіцьця. Калгасны рух перарастае ў сапраўдны масавы рух бядняцка-сераднянцкага сялянства і захапляе цэлыя вёскі, сельсаветы і нават раёны. **Па 36-ці сельсаветах БССР калектывізавана ад 50 да 100 проц. сялянскіх гаспадарак, па 8-мі раёнах — ад 20 да 60 проц.** Будаўніцтва калгасаў праходзіць, галоўным чынам, на землях працоўнага карыстаньня. **Мы зараз маем 1.713 калгасаў на плошчы 336.720 гэкт. — у тры разы больш, чым за мінулыя 8 год работы.**

Гэта таму, што партыя і савецкая ўлада праводзілі і праводзяць правільную ленінскую лінію рашучага наступленьня на кулака.

У справу калгаснага будаўніцтва і рэканструкцыі сельскае гаспадаркі непасрэдна ўключылася рабочая кляса. Тыя сотні і тысячы рабочых брыгад, якія выяжджалі ў вёскі БССР для практычнай дапамогі асноўнай масе сялянства перабудаваць сваё жыцьцё, **зьявіліся лепшымі агітатарамі за калектывізацыю, адыгралі вялікую ролю ў арганізацыі і накіраваньні шырокіх мас сялянства на шлях калектывізацыі.**

Па меры рашучага наступленьня на капіталістычныя элементы ўсё больш і больш абвастраецца клясавая барацьба. Кулак не здае бяз бою сваёй пазыцыі. Ён супраціўляецца правядзеньню мераприемстваў партыі і савецкай улады і ад агітацыі ў радзе выпадкаў пераходзіць да адкрытага тэрору.

Агульная ацэнка 1928-29 гаспадарчага году характарызуецца наступным чынам: калектывізацыя стала сапраўды масавым рухам дзесяткаў тысяч бядняцка-сераднянцкіх гаспадарак. **Разам з батраком і бедняком у калгасы пайшлі вялізарныя масы сераднянцтва.** Узмацніўся саюз рабочае клясы з бядняцка-сераднянцкай масай сялянства, узрос аўтарытэт партыі і савецкай улады.

За апошні час, — кажа далей т. Рачыцкі, — калгасны рух узрастае з нячуваным тэмпам. **За адзін толькі кастрычнік арганізавана 230 новых калгасаў. 200.000 гэкт. новай зямлі ўцягнута ў аграмаджаны сэктар сельскае гаспадаркі.** Гэта дае нам магчымасьць запраектаваць значна большыя тэмпы калгаснага будаўніцтва, чым гэта вызначаецца кантрольнымі лічбамі.

Наркамзем уносіць на абгаварэньне і зацьвярджэньне сэсіі ЦВК наступныя прапановы:

— Давесьці пасеўную плошчу аграмаджанага сэктару да канца 1930 году да 20 проц. усёй пасеўнай плошчы, суспроць запраектаваных кантрольнымі лічбамі на 1929-30 г. 13 проц.

Апрача таго мы лічым патрэбным у гэтым-жа годзе прыступіць да арганізацыі двух калгасаў - гігантаў — **бульбяна-жывёлагадоўчага і ільняна-малочнага, плошчай у 60-80 тыс. гэкт. кожны.**

Далей тав. Рачыцкі спыняецца на бліжэйшых задачах, якія стаяць перад калгасным рухам.

— Зараз трэба рашуча паставіць пытаньне аб прыстасаваньні беларускай прамысловасьці да патрэб буйнога сацыялістычнага зямляробства. Нядрэнна было-б падмацаваць калгасны рух да вясны парай тысяч трактараў, з дзьвюма-трыма машына-трактарнымі станцыямі, некаторай колькасьцю складаных малатарань, жнявярак і г. д. Аднак, гэта ня значыць, што мы павінны чакаць гэтых трактараў і машын, затрымліваючы калектывізацыю. Трэба больш поўна і лепш скарыстоўваць тыя сродкі вытворчасьці, якія ёсьць у сялянства.

Тав. Рачыцкі асабліва шмат увагі зьвярнуў на пытаньне аб падрыхтоўцы кадраў арганізатараў і кіраўнікоў буйных гаспадарак і спэцыялістых сельскае гаспадаркі. Да канца пяцігодкі БССР патрэбна ня менш **20.000 спэцыялістых, з іх 10.000 з вышэйшай і сярэдняй асьветай.** Трэба таксама падрыхтаваць ня менш 20 тысяч трактарыстых —у 10 раз больш, чым гэта вызначана пяцігодкай. Трэба больш шырока ўзмаціць тэмп падрыхтоўкі спэцыялістых і агранамізацыі калгасьнікаў.

Савецкі апарат і асабліва зямельныя органы павінны безадкладна перабудаваць сваю работу з тым, каб яна адпавядала патрабаваньням жыцьця і масаваму калектыўнаму руху.

Энтузіястыя калектывізацыі

Шумнымі воплескамі сустракае сэсія зьяўленьне на трыбуне прадстаўніка першага ў БССР раёну масавай калектывізацыі, старшыню Клімавіцкага РВК т. Тарасенка.

У гарачай прамове, т. Тарасенка паведамляе дэлегатам аб тых шляхох, па якіх ішла масавая калектывізацыя Клімавіцкага раёну.

Калектывізацыя Клімаўшчыны пачалася з арганізацыі калгасу «Ленінскі Шлях» у в. Дубравіцы Спачатку сяляне ўсё ж такі ўяўлялі сабе жыцьцё ў калгасе. Кулакі запалохвалі сялян усялякімі выдумкамі. Але партыйная ячэйка ўзьняла на ногі ўсю грамадзкасьць вёскі, усіх членаў партыі, камсамол, вясковы актыў, жанчын-дэлегатак, быў праведзен цэлы рад сходаў. Агульны **оход вёскі, на якім** выразалася пытаньне аб арганізацыі калгасу, працягваўся больш за 3 дні. У выніку ў калгас пайшлі ўсе сяляне, за выключэньнем 5 кулакоў.

На вясковым сходзе ў Дубравіцах прысутнічалі таксама сяляне навукольных вёсак. Зараз-жа пасьля пастановы вёскі Дубравіцы арганізавацъ калгас сялянамі суседняй в. Папехінка была прыслана дэлегацыя з просьбай уключыць іх у агульны калгас.

Арганізацыя калгасу праходзіла значна лягчэй, чым яго замацаваньне. Самая цяжкая работа была ў першыя дні, калі трэба было сачыць за кулакамі і заможнікамі, якія часткова ўвайшлі ў калгас з мэтай разбурыць яго з сярэдзіны. Увесь час прыходзілася вартаваць, каб тут-жа на месцы ліквідаваць усе непаразуменьні, якія ўзьнікалі ў першыя дні.

Вялікую дапамогу ў арганізацыі калгасаў аказалі рабочыя брыгады, якія пасылаліся клімавіцкімі рабочымі. Рабочая брыгада прывезла калгасьнікам дзьве жнявяркі, арфу, карнярэзку і інш. прылады. Сяляне ўбачылі, што рабочыя ня толькі на словах, але і на справе дапамагаюць калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Асабліва слабымі мы адчувалі сябе пры складаньні ўнутранога распарадку калгасу, які налічваў ужо 600 рабочых рук. Трэба было ўстанавіць такі парадак, каб кожны меў работу, але прыкладаў арганізацыі ўнутранога распарадку ня было. Калгассаюз, які павінен быў прадугледзець гэта пытаньне, нічога не зрабіў, і райкому прышлося самому распрацаваць плян работы калгасу. У першую чаргу ў калгасе былі аграмаджаны с.-г. інвэнтар і рабочая жывёла. Пры правядзеньні першай баразны сялянства пераканалася ў жыцьцёвасьці калгасу, яно сапраўды ўбачыла, што ў калгасе ўмовы працы лепшыя, чым у індывідуальнай гаспадарцы.

Яшчэ большую рэвалюцыю зрабіла зьяўленьне трактара. Калі сяляне ўпяршыню ўбачылі работу трактара, многія з іх плакалі. Адна жанчына-бяднячка, калі праз яе палоску праехаў трактар, спалохалася, бо думала, што ён (трактар) павязе ўсю яе палоску за сабой.

Далейшая калектывізацыя была ўзята ў напрамку стварэньня апорных калгасаў у розных канцох раёну. Быў арганізаваны рад экскурсій у калгас «Ленінскі Шлях», дзе сяляне знаёміліся на справе з жыцьцём калгасу. Калгасьнікі «Ленінскага Шляху» арганізоўвалі брыгады, якія выяжджалі на месцы.

У першую чаргу арганізоўваліся калгасы ў тых мясцох, дзе былі моцныя партыйныя ячэйкі. Пасьля ў гэту работу былі ўцягнуты члены сельсаветаў і вясковы актыў. Паступова ўзьнікла пытаньне аб масавай калектывізацыі Клімавіцкага раёну.

Масавая калектывізацыя спаткала рэзкае супраціўленьне з боку кулацтва. Кулакі на кірмашы ў Клімавічах, выдаючы сябе за калгасьнікаў, апавядалі аб усялякіх жахах у калгасах. Кулакі не прадавалі сена і іншых прадуктаў калгасьнікам. У вёсцы Пянькоўка кулак задушыў сваю жонку за тое, што яна хацела пайсьці ў калгас. У Макеевічах старшыня сельсавету атрымаў запіску, у якой было паказана, што калі ён ня кіне гаварыць аб калгасах, яго маемасьць будзе спалена, а ён сам забіты.

Нам удалося калектывізаваць Клімаўшчыну на 80 проц. на плошчы ў 80 тысяч гэкт. Сялянства пачало ўжо адчуваць вынікі калектывізацыі. Урадж**ай у калгасах быў значна больш**ым ва ўсіх індывідуальных гаспадарках, нават культурных. **Беднякі калгасьнікі атрымалі на 50 проц. хлеба больш, чым яго мелі-б пры індывідуальным вядзеньні гаспадаркі.**

Для таго, каб замацаваць дасягненьні Клімавіцкага раёну ў галіне калектывізацыі, трэба прыняць рад мер.

Ва ўсіх канцох раёну растуць калгасы, але яны ня маюць адпаведных кіраўнікоў, якіх неабходна падрыхтаваць у першую чаргу. Невыстарчальна такса сама пастаўлена культурнае абслугоўваньне калгасьнікаў. На 37 буйных калгасаў ёсьць усяго 5 хат-чытальнь. Трэба дабіцца электрыфікацыі ўсяго калектывізаванага раёну. На ўвесь калектывізаваны раён на сёньнешні дзень ёсьць усяго 2 трактары. Трэба падняць пытаньне аб пабудове ў раёне прамысловых прадпрыемстваў.

Прыклад Клімавіцкага раёну паказвае на практыцы памылку палітыкі правых апартуністых, якія ня вераць у магчымасьць стварэньня буйных калгасаў у Беларусі.

Па 36 сельсаветах БССР калектывізавана ад 50 да 100 проц. сялянскіх гаспадарак. За адзін толькі кастрычнік у Савецкай Беларусі арганізавана 230 новых калгасаў, 200.000 гэкт. новай зямлі дапучаны ў аграмаджаны сэктар. 80 проц. Клімавіцкага раёну занята калектывамі.

Да канца пяцігодкі БССР неабходна падрыхтаваць 20 тысяч спэцыялістых сельскай гаспадаркі

Батрачкі Ляванчык, Кавалёва і Зубка ў часе перапынку на сэсіі

ГОЛАС ФАБРЫК, ЗАВОДАЎ І ВЁСАК

Спрэчкі па дакладу т. Галадзеда аб кантрольных лічбах на 1929-30 год

(Ранішняе пасяджэньне 21 лістапада)

— Выканаем пяцігодку за 4 гады.

Гэта голас фабрык і заводаў, які гучэў з трыбуны сэсіі ЦВК БССР па дакладу т. Галадзеда аб кантрольных лічбах на 1929-30 г. Члены сэсіі гаварылі **аб вялікім працоўным энтузіязьме, які ахапіў шырокія рабочыя масы.**

— Рабочыя—кажа т. Бэрэінг (Віцебск),—добра ведаюць аб тэмпах пігодкі, яны мабілізуюць сваю актыўнасьць, узьнімаюць новыя пласты працоўных, якія яшчэ ня ўцягнуты ў сацыялістычнае спаборніцтва.

Права-апартуністычныя ныцікі гаварылі, што мы на справімся з выкананьнем пяцігодкі. Жыцьцё поўнасьцю пацьвердзіла правільнасьць генэральнай лініі партыі, правільнасьць пляну вялікіх работ.

— На ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, кажа работніца фабрыкі «Прафінтэрн» т. Яўна, ёсьць вялікія дасягненьні. Тэмпы індустрыялізацыі і калектывізацыі трэба яшчэ больш узмацніць.

Дзесяткі прамоўцаў гаварылі аб вялікай хвалі калектывізацыі, якая захлынула нашу рэспубліку і перакуліла ўсе намечаныя пляны.

— У Аршанскай акрузе,— кажа т. Хандогін,—ёсьць вёскі, **якія калектывізаваны на 90 проц. У Круглянскім раёне калектывізавана 40 проц. бядняцкіх і сераднянцкіх гаспадарак.**

Бурны рост калгасаў выклікаў абвастрэньне клясавай барацьбы на вёсцы.

— Кулак,—кажа калгасьнік т. Пугачоў—усімі сіламі імкнецца сарваць нашы пляны. Ён ўжывае розныя хітрыкі, часамі трапляе ў калгас а тым, каб яго разбурыць з сярэдзіны. Кулаку трэба даць рашучы адпор.

Калгасам не хапае машын, угнаеньня. Заводам трэба так перабудаваць сваю работу, **каб яны лепш абслугоўвалі аграмаджаны сэктар сельскай гаспадаркі.**

У спрэчках вялікае месца занялі пытаньні культурнай рэвалюцыі. Прадстаўнікі самых далёкіх раёнаў Мазырышчыны, Гомельшчыны скардзіліся на тое, што калгасы часта развальваюцца з-за адсутнасьці аграномаў, каморнікаў. Вёска патрабуе настаўнікаў, дактароў і наогул культурных сіл, якія дапамаглі-б змагацца з цемрай на беларускай вёсцы і ісьці больш шпаркім тэмпам наперад.

* * *

На вячэрнім пасяджэньні сэсіі цягнуліся далей спрэчкі па дакладу т. Галадзеда.

БОЛЬШ УВАГІ ГАРОДНІЦТВУ

Выступіўшы т. Пыжыкаў падкрэсьліў, што мы мала зьвяртаем увагі на разьвіцьцё садоўніцтва і гародніцтва, для чаго ў нас ёсьць надзвычайна добрыя кліматычныя ўмовы. Каля 30 проц. усёй плошчы БССР прыгодны для садоўніцтва і гародніцтва. Але гэтыя магчымасьці ня былі выкарыстаны належным чынам.

ВЯЛІЗАРНЫ РОСТ КАПІТАЛЬНАГА БУДАЎНІЦТВА

Сродкі, якія ўкладаюцца ў гэтым годзе ў прамысловасьць,—кажа т. **Гальштэйн** (Дзяржплян),—большыя, чым увесь кошт прамысловасьці, якая была пакінута нам буржуазіяй у спадчыну пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Сума якая вызначана на капітальнае будаўніцтва на наступны год, складае 70 мільёнаў руб. Мы пачынаем будаўніцтва ў БССР такіх галін прамысловасьці, аб якіх да рэвалюцыі на Беларусі пават ня ведалі. Далей т. Гальштэйн спыняецца на вялізарным росьце электрыфікацыі БССР і на падрыхтоўцы рабочай кваліфікаванай сілы.

ЯКАСЬЦЬ ПРАДУКЦЫІ ЯШЧЭ НЕ ЗАЎСЁДЫ ДОБРАЯ

Трэба ў нашых кантрольных лічбах і крэдытных плянах,—кажа т. **Бэнэн**,—зьвярнуць асаблівую ўвагу, каб тэмпы ўздыму прамысловасьці і сельскай гаспадаркі яшчэ больш павялічыліся. Далей т. Бэнэк адзначае, што якасьць прадукцыі яшчэ не заўсёды бывае добрая. Мы маем рад скаргаў з боку спажыўцоў—рабочых і сялян—на дрэнную якасьць прадукцыі. Мы маем выпадкі калі на працягу аднаго-двух тыдняў развальваюцца новыя боты. Трэба таму з самага пачатку, як толькі тавар паступае ад селяніна ў выглядзе сырцу, зварачаць больш увагі на яго якасьць.

НЕ ПРЫСТАСАВАЛІСЯ ДА АБСЛУГОЎВАНЬНЯ КАЛГАСАЎ

Тав. Матус падкрэсьлівае, што да гэтага часу работа раду савецкіх органаў, як Наркамзем, Наркамасьветы, Наркамат Аховы Здароўя і інш., ня была прыстасавана да абслугоўваньня калектыўных гаспадарак. Напрыклад, у такой акрузе, як Полацкая, у калгасах, няма **ніводнай школы, ні аднаго лячэбнага пункту.** Трэба перабудаваць работу ўсіх нашых арганізацый на вёсцы, прыстасаваўшы яе да справы калектывізацыі.

ЗГУРТУЕМ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ВОКОЛ КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА

На трыбуне Наркамасьветы т. Пятун. Культурным будаўніцтвам датуль, — кажа прамоўца, — цікавіліся амаль што выключна працаўнікі асаты. У гэтым годзе на культурнае будаўніцтва вызначана **да 50 проц. усёй бюджэту.** Перад намі стаіць задача згуртаваць вакол пытаньняў народнасьветы шырокую грамадзкую думку. Вяз гэтага гаварыць аб выкананьні посьпехам нашых плянаў нельга.

* * *

Пасьля спрэчак з заключным словам выступіў **старшыня СНК т. Галадзед.**

Дзеньнік сэсіі

Увесь дзень 22 лістапада працягваліся спрэчкі па дакладу т. Рачыцкага. Выказаліся т.т. Грышкевіч, Мацюўская, Дубінін, Савановіч, Сьмірноў, Ласкін, Цалка, Аспалоўскі, Лоцманаў, Варапка, Барсукоў, Г. Гарацкі, Зыбко, Соскін, Клімянкоў, Лібман, Бажанаў, Акеючык і Шінчук.

Сёньня на ранішнім пасяджэньні пяць спрэчак па дакладу т. Рачыцкага, заключнае слова дакладчыка і даклад тав. Рачыцкага аб утварэньні Наркамзему СССР. На вячэрнім пасяджэньні даклады аб дзяржаўным бюджэце БССР.

КАЛДАГАВОРНАЯ КАМПАНІЯ ПРАВОДЗІЦЦА СА ЗНАЧНЫМ СПАЗЬНЕНЬНЕМ

ЯШЧЭ НЯ СКОНЧАНА ПРАВЕРКА ІСНУЮЧЫХ КАЛДАГАВАРОЎ

Абгаварэньне новых калдагавароў яшчэ ня вышла за сьцены габінэтаў

Як быў арганізаваны „налёт“

Паставіўшы перад сабою мэту, выявіць, як ідзе праверка выкананьня старых калдагавароў і як рыхтуюцца прафарганізацыі да кампаніі заключэньня новых калдагавароў, якая карэнным чынам адрозьніваецца ад кампаній мінулых гадоў, — рэдакцыя газ. «Зьвязда» арганізавала «налёт лёгкай кавалерыі» на прадпрыемствы і ўстановы гор. Менску. Для гэтай мэты скарыстаны «кавалерыстыя» і студкоры Менскага палітэхнікуму.

Увечары 19-XI была праведзена інструкцыйная парада з «налётчыкамі», былі даны дырэктывы, што выяўляць, па што зьвярнуць увагу.

Раніцой 20 лістапада «лёгкая кавалерыя» з 30 чалавек пачала «налёт». «Кавалерыстыя» пабывалі амаль ва ўсіх прадпрыемствах гораду і ў радзе ўстаноў, правялі гутаркі з прадстаўнікамі заводзкіх «трыкутнікаў», гутарылі з удзельнікамі брыгад, з асобнымі рабочымі.

Ня ўсюды ахвотна давалі патрэбныя весткі. Сакратар ячэйкі **гуты «Пралетары»** адмовіўся гаварыць з абсьледвальнікам: «Якая справа газэце «Зьвязда» да калдагавароў?». У Белкаапсаюзе сакратар ячэйкі паслаў да мясцкому і рэдкалегіі. На некаторых прадпрыемствах дырэктары заявілі, што яны «вельмі заняты, няма часу заняцца з вамі».

Але абсьледвальнікам усё-ж удалося дастаць патрэбныя даныя. Увечары адзін за другім пачалі прыходзіць «налётчыкі» ў рэдакцыю. Запоўненыя анкеты і заметкі далі поўны малюнак ходу калдагаварнай кампаніі на прадпрыемствах. Вынікі «налёту» мы сёньня друкем.

Работу брыгады пэд абстрэл рабочай самакрытыкі

(Дражджавы завод «Чырвоная Заря»)

Была вылучана рабочая брыгада спэцыяльна для праверкі выкананьня калдагавору. Сяк-так праверка была праведзена і зроблены з яе вывады. Што-ж гэта за вывады? Ці можна ўявіць сабе, як выконваўся калдагавор на працягу году з боку адміністрацыі і рабочых і ці можна, грунтуючыся на вывадах брыгады, заключаць новы дагавор?

Трэба проста сказаць, што вывады брыгады нікуды нявартыя.

Што адміністрацыя паказала, тое брыгадзіры запісалі. Ёсьць, моў, ахова працы, нібы добра пастаўлена тэхніка бясьпечнасьці і інш. Брыгада не заўважыла раду парушэньняў пунктаў калдагавору.

Прычынай гэтаму зьяўляецца тое, што ячэйка і ў першую чаргу заўком слаба кіравалі правядзеньнем калдагаварнай кампаніі. Праўда, ячэйка сваячасова заўважыла дрэнныя вынікі працы брыгады і не зацьвердзіла яе вываду.

Трэба зараз-жа направіць усю працу брыгады і ўнікнуць тых памылак, якія зрабіла брыгада пры праверцы.

Што паказаў налёт

«Зьвязда» ў № 263 ад 18 лістапада зазначала, што **прафсаюзы Беларусі ня ведаюць, як ідзе праверка існуючых калдагавароў і падрыхтоўка да новай калдагаварнай кампаніі.** Перадавая падкрэсьліла, што асобныя даныя, якія атрымала рэдакцыя, сыгналізуюць спазьненьне кампаніі.

Рэдакцыя парашыла праверыць непасрэдна на прадпрыемствах ход кампаніі. «Налёт» на прадпрыемствы і ўстановы, праведзены «лёгкай кавалерыяй» і студкорамі палітэхнікуму, паказаў абсалютную правільнасьць апасак рэдакцыі. **Тэрміны, устаноўленыя ў лісьце ЦСПСБ і ВСНГБ, амаль нідзе ня выкананы, кампанія праводзіцца з вялікім спазьненьнем.**

Ліст ЦСПСБ і ВСНГБ прапануе не пазьней 1-га лістапада скончыць праверку старых дагавароў. На справе праверка скончана толькі на некалькіх прадпрыемствах.

На **гарбарні «Бальшавік»** вынікі работы брыгад яшчэ не абгаворваліся ні ў цэхах, ні на агульным сходзе (абсьледв. **В. Сарока**).

На **заводзе «Камунар»** праверка дагавароў ня скончана (абсьл. **Сьцяпанаў**). Ня скончыла работы брыгада **цукернай фабрыкі «Прагрэс».** Абсьледвальнік **Віньнікаў** паведамляе, што кампанія праверкі дагавору на **фабрыцы «Адраджэньне»** толькі «набліжаецца да канца». Такі-ж малюнак на заводзе **«Дзяржаўпрацоўшчык»** (абсьледвальнік **Карнізоўскі**). Брыгада на **Эльводзе** да гэтага часу яшчэ не падвяла вынікаў праверкі (**Л. Каплан**). На **каўбаснай** фабрыцы брыгада толькі 16 лістапада пачала працу, а на фабрыцы **«Чырвоны Тэкстыльшчык»** — толькі 14-га.

Брыгадзіры чыгуна-ліцейнага заводу **«Энэргія»** з-за Кастрычніцкіх сьвят «не пасьпелі» скончыць работы (**В. Кузьмін**). На **шчотачнай фабрыцы** даклады брыгады яшчэ ня ставіліся на пэхавым і агульным сходах (**Макарэнка**).

З вялікім спазьненьнем праводзіцца кампанія на гуце **«Пралетары»** (абсьлед. **Мірончык**) і на абутковай фабрыцы (**Радаў**).

На **фабрыцы «Чырвоны Тэкстыльшчык»** і абутковай фабрыцы, наперакор дырэктывае, брыгады не выбіраліся на агульных сходах, а складаліся з добраахвотнікаў.

На **махорачнай фабрыцы** зусім не вылучалі брыгады. Там стары калдагавор абгаворваўся на прафактыве з... 10 чалавек. На **заводзе «Чырвоная Заря»** праверка выразілася ў махэнічнай чытцы дагавору на прафактыве. На хлебазаводзе адна і таяж брыгада правярала выкананьне сацыялістычных і калектыўных дагавароў.

Першыя вынікі праверкі, па даных абсьледваньня, гавораць аб тым, што **адміністрацыя амаль усюды ня выконвала раду пунктаў калектыўных дагавароў.** Абсьледвальнікі аднадушна падкрэсьліваюць, што вельмі дрэнна выконваліся пункты **аб ахове працы.** Спэцвопратка выдаецца са спазьненьнем, мала ўвагі зьвяртаецца на тэхніку бясьпечнасьці, дрэнна працуюць вэнтыляцыйныя ўстаноўкі. На **гарбарні «Бальшавік»** няма гатаванай вады, няма памяшканьня для хаваньня вопраткі, няма рукамыйнікаў. На **гуце «Пралетары»** — провесі пагражаюць здароўю рабочых, спэцвопратка няважнай якасьці. Дрэнныя ад іх меры да выкананьня кантрольных лічбаў па прадпрыемствах на 1929-30 г.

3. У адпаведнасьці з дырэктыўным лістом УсеЦСПС і ВСНГ аб пераразаключэньні калектыўных дагавароў, пацьвердзіць, што **«задача надыходзячай калдагаварнай кампаніі заключаецца ў тым, каб шляхам правільнага нармаваньня працы і рэгуляваньня зарплаты ўстанавіць такія суадносіны паміж ростам зарплаты і прадукцыйнасьцю працы, якая гарантавала-б выкананьне прамфінпляну на кожным паасобным прадпрыемстве».**

У сувязі з гэтым гаспадарчыя органы і прафсаюзы павінны ўключаць у калектыўныя дагаворы наступны пункт:

«Абодвы бакі абавязуюцца выканаць ніжэйнаступныя паказальнікі (кантрольныя лічбы) па прадукцыйнасьці працы... і зарплаце, устаноўленыя для данага гаспадарчага абʼяднаньня (трэсту і яго прадпрыемстваў)... кіруючыся гэтым, як асновай пры рэгуляваньні зарплаты і тэхнічным нармаваньні.

Пры гэтым гаспадарчы орган абавязуецца ажыцьцявіць прадугледжаныя прамфінпляном тэхнічна-вытворчыя і рацыяналізатарскія мерапрыемствы.

Сакратар УсеЦСПС **Г. ВЭЙНБЭРГ.**
Старшыня ВСНГ СССР **КУЙБЫШАЎ.**

Не падмяняць дагавароў па спаборніцтве калдагаварамі

Усім прафэсыянальным арганізацыям і гаспадарчым прадпрыемствам

У сувязі з тым, што мелі месца канфлікты на мясцох паміж гаспадарчымі органамі і прафсаюзамі па пытаньні аб уключэньні ў калдагавары кантрольных лічбаў, УсеЦСПС і ВСНГ прапануюць кіравацца наступнымі палажэньнямі:

1. Лічыць няправільнай падмену калдагаварамі гаспадарча - палітычных дагавароў па сацыялістычным спаборніцтве, праз уключэньне ў калдагавары ўсіх лічбавых паказальнікаў на кантрольных лічбах прамфінпляну, што павінны ўключацца ў дагавары па сацыялістычным спаборніцтве.

2. Прапанаваць прафарганізацыям і гаспадарчым органам пры пераразаключэньні калдагавароў уключаць уступны пункт такога зьместу:

«Выходзячы з агульна-клясавых задач пралетарыяту — ажыцьцяўленьня хуткіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, як патрэбнае ўмовы замацненьня пралетарскай дыктатуры, абароназдольнасьці краіны і паляпшэньня матар'яльна-бытовага і культурнага становішча рабочае клясы, — гаспадарчыя органы, прафарганізацыі, рабочыя і служачыя абавязуюцца ўжываць усе залежныя ад іх меры да выкананьня кантрольных лічбаў па прадпрыемствах на 1929-30 г.

3. У адпаведнасьці з дырэктыўным лістом УсеЦСПС і ВСНГ аб пераразаключэньні калектыўных дагавароў, пацьвердзіць, што «задача надыходзячай калдагаварнай кампаніі заключаецца ў тым, каб шляхам правільнага нармаваньня працы і рэгуляваньня зарплаты ўстанавіць такія суадносіны паміж ростам зарплаты і прадукцыйнасьцю працы, якая гарантавала-б выкананьне прамфінпляну на кожным паасобным прадпрыемстве».

У сувязі з гэтым гаспадарчыя органы і прафсаюзы павінны ўключаць у калектыўныя дагаворы наступны пункт:

«Абодвы бакі абавязуюцца выканаць ніжэйнаступныя паказальнікі (кантрольныя лічбы) па прадукцыйнасьці працы... і зарплаце, устаноўленыя для данага гаспадарчага абʼяднаньня (трэсту і яго прадпрыемстваў)... кіруючыся гэтым, як асновай пры рэгуляваньні зарплаты і тэхнічным нармаваньні.

Пры гэтым гаспадарчы орган абавязуецца ажыцьцявіць прадугледжаныя прамфінпляном тэхнічна-вытворчыя і рацыяналізатарскія мерапрыемствы.

Сакратар УсеЦСПС **Г. ВЭЙНБЭРГ.**
Старшыня ВСНГ СССР **КУЙБЫШАЎ.**

Абышліся без рабочай брыгады

(Махорачная фабрыка)

Аб тым, што зараз праводзіцца кампанія праверкі і заключэньня новых калдагавароў, ні фабком, ні партячэйка нічога ня ведаюць.

Брыгады для праверкі выкананьня калдагавору і абмеркаваньня яго на шырокім рабочым сходзе ніхто не вылучаў. Бачыце, ёсьць прафактыў, які павінен займацца гэтымі справамі. Але тыву для абмеркаваньня калдагавору зьявілася толькі 10 чалавек. Прафактыў выявіў шмат нявыкананых пунктаў калдагавору: спэцвопратка не выдавалася, ручнікі таксама, умывальнікаў ня было і г. д. Зразумела, што такоконтр-рэвалюцыйнае «абмеркаваньне» калдагавору вытрымлівае крытыкі.

НАЛЁТ „ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫІ“ НА ПРАДПРЫЕМСТВЫ

У савецкіх установах калдагаворная кампанія не пачыналася

ЦП саюзу савецкіх і гандлёвых служачых ня выканала дырэктыў ЦСПСБ

Няправільная палітычная лінія сучаснага кіраўніцтва ЦП саюзу савецкіх і гандлёвых служачых, незразуменьне ім задач прафарганізацыі у рэканструкцыйны пэрыяд, асабліва адбіліся на правядзеньні калдагаворнай кампаніі па саюзе. На нарадзе старшынь мясцкомаў саюзу, якая адбылася 14 лістапада, ня была завострана ўвага на палітычным баку калдагаворнай кампаніі. Нізавыя прафарганізацыі, не атрымліваючы належных дырэктыў ад ЦП, зусім нядбайна адносяцца да праверкі і заключэньня дагавароў.

«Налёт» па Менскія ўстановы 20 лістапада выявіў рад фактаў, якія сыгналізуюць аб пагрозе правалу калдагаворнай кампаніі, як палітычнай кампаніі, па саюзе савецкіх і гандлёвых служачых.

Мясцком Дзяржбанку толькі 18 лістапада атрымаў цыркуляр ЦП. Стары дагавор не правяраецца, брыгады для праверкі ня вылучаны. Насьценгазэта маўчыць аб кампаніі. Аб новых умовах калдагавароў ведаюць толькі члены мясцкому (абсьледвальнік **Лагута**).

Нічога ня зроблена і ў калектыве **Менакрфа.** Старшыня мясцкому даў абсьледвальніку т. **В. Сарока** клясычны адказ: «Машыністкам спецвопратка выдана, а што нам больш патр ба. З працыісцыпліной трошкі дрэнна, але гэта ужо «як водзіцца». Насьценгазэта ня лічыць патрэбным гаварыць аб калдагаворнай кампаніі.

Ня вылучана брыгада па праверцы і не абгаворваўся калдагавор і ў калектыве **Наркамюсту.** Абсьледвальнік хацеў азнаёміцца з насьценгазэтай, як яна праводзіць кампанію, але насьценгазэта знаходзілася... пад замком, а ключ ад яе ў вартаўніцы.

Зусім не разгорнута кампанія і ў калектыве **Менакрэемаддзелу.** Ня створана нават брыгада па праверцы старога дагавору. Яшчэ не прыступілі да абгаварэньня новага дагавору (абсьледвальнік **Ярашэвіч**). У **Белкаапсаюзе** брыгаду вылучыў стары распушчаны мясцком, на агульным сходзе яна не зацьвярджана. Брыгада яшчэ не прыступіла да працы. Аб новым калдагаворы ніхто ў калектыве на ведае (абсьледвальнік **Ганчароў**).

Вывады з усяго сказанага напрошваюцца самі сабой. Іх напоўна зробіць па-зачарговы пленум ЦП саюзу савецкіх і гандлёвых служачых.

С. М.

Ад рэдакцыі: Сёньня мы зьмяшчаем... скарыстана...

Рабочыя Віцебшчыны паказалі ўзорныя прыклады высокай прадукцыйнасьці працы

Абуткавая фабрыка ў выніку сацыялістычнага спаборніцтва выканала вытворчы плян у 4-м квартале з перавышэньнем на 10 проц. На панчошнай фабрыцы пад уплывам ударнікаў прадукцыйнасьць працы ўзьнялася на 15 проц. 600 рабочых лесазаводу ўступілі ва ўдарныя брыгады

ПРАФСАЮЗЫ, ГАСПАДАРНІКІ І КАМСАМОЛЬСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ НЕ ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА ЗЬЕЗДУ

(Ад нашага віцебскага карэспандэнта)

19-га лістапада скончыў сваю работу акруговы зьезд ударнікаў. Трэба проста сказаць: прафсаюзы фармальна адносіліся да гэтай важнейшай справы. Нягаданы зьезд нідзе не абгаворваліся. Ня была створана належная грамадзкая думка. Больш таго, ініцыятыва некаторых фабкомаў (Мэтпром і інш.) аб арганізацыі акруговай выстаўкі па сацыялістычным спаборніцтве **ня была падтрымана акруговымі праўленьнямі прафсаюзаў** і выстаўка правалілася. Нядбайна аднесьліся да зьезду і камсамольскія арганізацыі, ня гледзячы на тое, што на радзе прадпрыемстваў ёсьць ударныя камсамольскія брыгады, якія цікавіліся работай надыходзячага зьезду ўдарнікаў.

Ня лепшымі аказаліся і гаспадарнікі, якія давялі сваю непаваротлівасьць і нячуласьць.

Ня гледзячы на гэта, зьезд ударнікаў прайшоў у абставінах **вялікай актыўнасьці дэлегатаў.** Па аднаму толькі дакладу намесьніка старшыні ВСНГ тав. Баля аб кантрольных лічбах на 1929-30 год і гаспадарчых выніках мінулага году ў спрэчках выказаліся 23 дэлегаты. Такая-ж актыўнасьць назіралася і пры спрэчках па дакладу аб сацыялістычным спаборніцтве.

Адзін за другім выходзілі на трыбуну ўдарнікі і рапартавалі **аб буйных вытворчых дасягненьнях прадпрыемстваў Віцебшчыны, дзякуючы нячуванаму энтузіязму рабочых, якія паказалі прыклады высокай прадукцыйнасьці працы.**

Работніца Анэрцава паведаміла, што ў выніку работы ўдарнікаў прадукцыйнасьць працы на панчошнай фабрыцы павялічылася **на 15 проц.,** а па асобных цэхах — нават і на 24 проц.

Сацыялістычнае спаборніцтва ахапіла і такіх рабочых, якія яшчэ нядаўна былі адсталымі. Некаторыя з іх зараз знаходзяцца ў першых радах ударнікаў. Напрыклад, рабочы папяровай фабрыкі «Чырвоная Зорка» Сарока, які раней вызначаўся сваімі дрэннымі адносінамі да працы, сёньня выступае на зьезьдзе, **як лепшы ўдарнік фабрыкі,** нядаўна занесены на чырвоную дошку. **На гэтай фабрыцы амаль усе рабочыя ўступілі ва ўдарныя брыгады.**

На абутковай фабрыцы імя Лекерта ў выніку разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва ў 4-м квартале вытворчы плян выкананы **з перавышэньнем на 10 проц.** у той час, калі ў першым квартале ён быў недавыкананы на 32 проц.

І такіх рапартаў можна было чуць на зьезьдзе бясконца. У іх адчувалася надзвычайная бадзёрасьць і энтузіязм, **якія зьяўляюцца лепшым адказам панікёрам і ныцікам з права-апартуністычнага лягеру.**

На зьезьдзе работніца швэйнай фабрыкі Бараноўская выклікала работніц свайго цэху зьвіліць расцэнкі. Рабочыя лесазаводу ў тэлеграме на імя зьезду паведамляюць: «600 рабочых лесазаводу ў гонар зьезду поўнасьцю ўступілі ва ўдарныя брыгады, лесапільшчыкі адзначаюць свой удзел у спаборніцтве добраахвотным зьніжэньнем расцэнак».

На фабрыцы «Чырвоная Зорка» нават прышлося перагледзець дагавор на сацыялістычным спаборніцтве, бо замест вызначаных 3.300 клг. паперы на адну зьмену, рабочы Стома выпрацаваў 4.158 клг.

Зьезд праходзіў пад лёзунгам **поўнай адданасьці генэральнай лініі партыі, пад знакам выкананьня пяцігодкі за 4 гады.**

У прывітальных тэлеграмах на імя ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б зьезд пацьвердзіў сваю гатоўнасьць штодзённа дапамагаць партыі абярнуць СССР у краіну мэталю і сталі, у краіну трактараў і аўтамабіляў.

ВІЦЕБСКІ.

Распушчаны прэзыдыум ЦП саюзу савецкіх і гандлёвых служачых

ЦП зусім ня справілася з сваімі задачамі

Другі і апошні дзень работы па-за чарговага пленуму саюзу савецкіх і гандлёвых служачых прайшоў пад лёзунгам самай бязьлітаснай і рэзкай самакрытыкі. Актывісты, якія выступалі ў спрэчках, адзначалі **поўную адсутнасьць кіраўніцтва з боку ЦП, адарванасьць ЦП ад саюзнай масы, надзвычайна слабае разгортваньне самакрытыкі, развал работы ў радзе мясцкомаў.** Ня было ні аднаго выступленьня, якое гаварыла-б у абарону ЦП.

Прамоўцы адзначылі, што асобныя **члены прэзыдыуму вялі паход супроць рабкораў,** якія адважваліся крытыкаваць работу ЦП саюзу. ЦП імкнулася заглушыць самакрытыку, але яму гэта не ўдалося.

Рад выступаўшых таварышоў рэзка абвінавачваў ЦП **у адсутнасьці палітычнай работы, клясавага перавыхаваньня масы служачых.** Сярод працаўнікоў прыладаўкаў шмат чужых і адсталых элемэнтаў.

Ва многіх калектывах скрыўлена палітычная лінія. Мясцком Белкаапсаюзу хадайнічаў за кулака, санкцыянаваў выдачу выхадной дапамогі зладзеям і ліцэнцам. Прымаканы да гэтага мясцкому старшыня ЦП нават ня ведаў аб гэтакіх абураючых фактах.

Бельмі дрэнна праходзіць сацыялістычнае спаборніцтва. ЦП саюзу праявала гэту важную кампанію.

Віцебскі ЦРК выклікае Менскі, паміж абедзьвюма гандлёвымі сэкцыямі саюзу на працягу 4-х месяцаў вядзецца перапіска, расьце цяганіна, сацыялістычнага спаборніцтва ня было, а ЦП саюзу нават аб гэтым ня ведае.

Слаба праводзілася абарона інтарэсаў членаў саюзу. Служачыя ня скардзіліся ў мясцком і ў ЦП, яны праз іх галавы шукалі абароны ў РСІ і інш. органах, бо ня верылі ў дапамогу саюзу.

Саюз зусім не рэагаваў на рад заметак у насьцензгазэтах калектываў, у мясцовай прэсе і ў «Нашей Газете». «Няхай пішуць, і на нашай вуліцы будзе сьвята», гаварылі члены прэзыдыуму.

Старшыня ЦП тав. **Мурзіч** амаль не апраўдваўся, яму ня было аб чым гаварыць. Усё так ясна, так зразумела.

Позна ноччу па-зачарговы пленум супольна з актывам ухваліў аднагалосна рэзалюцыю, у якой адзначаў **дрэннае кіраўніцтва прэзыдыуму, адсутнасьць сувязі з нізамі, бюракратычныя адносіны да патрабаваньняў членаў саюзу. ЦП саюзу не мабілізавала масы вакол важнейшых задач, пастаўленых зараз партыяй перад саюзам. Былі выпадкі зажыму самакрытыкі.**

Пленум пастанавіў зьняць з работы старшыню ЦП т. Мурзіча, працаўнікоў ЦП—Рабініна Ляўчука, Агнієўскага і Гінзбург. Пленум пастанавіў перабрацъ увесь склад прэзыдыуму і склікаць па-зачарговы ўсебеларускі зьезд саюзу не пазьней студзеня.

Часова да зьезду выбраны новы прэзыдыум у складзе старшыні тав. **Плятнёва,** сакратара **Глікіна** і членаў: Сланімскай, Радкевіча, Захаравай, Шабека і **Сабалеўскай.**

Л—і.

Да рабочых Барысава

Абавостраньне клясавай барацьбы, рэвалюцыйны забастовачны рух у буйнейшых буржуазных краінах, актыўныя вулічныя бойкі паміж працай і капіталам (першамайскія і першажніўнскія падзеі) выклікалі нячуваны азьвярэлы белы тэрор з боку буржуазіі, яе лёкаяў сацыял-здраднікаў.

Вось перад намі толькі што атрыманая зводка белага тэрору за апошнія месяцы. Жудасна становіцца, калі чытаеш гэтыя лічбы. На 51 буржуазнай краіне **забіта 84.812 чалавек, паранена 20.947 чал., арыштавана 35.955 чал., зроблена вобыскаў — 21.334, пакараны сьмерцю 1.746 чал., засуджана на 4.662 гады катаргі і на 47.016 руб. штрафу, у 38 гападоўках прымала ўдзел 3.458 палітзьняволеных, якія працягваліся 13.977 дзён.**

Рост белага тэрору і фашызму, рост новых дзесяткаў тысяч ахвяр фашызму (забітыя, пакалечаныя, пакінутыя без дапамогі ўдовы і сіроты) **патрабуе ад усіх ячэек МОПР'у і ўсёй мопраўскай масы яшчэ больш узмацніць сваю працу, узьняць на больш высокі ўзровень сваю сьвядомасьць і пралетарскую салідарнасьць актыўнай дапамогай ячэйкам МОПР'у ў правядзеньні чарговых задач,** якія накіраваны на паляпшэньне працы МОПР'у, уздым актыўнасьці і інтэрнацыянальнага выхаваньня членаў МОПР'у, павялічэньне яго радоў і ўзмацненьне матар'яльнай дапамогі ахвярам фашызму.

З гэтай мэтай зараз праводзіцца ўсесаюзны агляд ячэек МОПР'у, месячнік вярбоўкі ў МОПР і кампанія зімовай дапамогі палітзьняволеным. Гэтыя кампаніі з посьпехам могуць быць праведзены толькі пры максымальнай актыўнасьці рабочае клясы ўсяго Савецкага Саюзу, якая ў большасьці сваёй уцягнута ў рады МОПР'у.

Трэба ведаць, што МОПР зьяўляецца інтэрнацыянальнай арганізацыяй і гэта ўскладае яшчэ большую адказнасьць на ячэйкі МОПР'у, каб яны сваю працу паднялі на такі ўзровень, што дало-б магчымасьць у любы час чула і актыўна адгукнуцца на ўсе праявы белага тэрору і фашызму ў буржуазных краінах. Гэта, бязумоўна, магчыма пры самым актыўным удзеле ячэек МОПР'у і пралетарскай сьвядомасьці ўсёй шматтысячнай мопраўскай масы.

З гэтай мэтай Менакругком МОПР'у накіроўвае ўдарную мопраўскую брыгаду да барысаўскіх рабочых, каб узмацніць тэмп правядзеньня чарговых задач МОПР'у (усесаюзны агляд, вярбоўка ў рады МОПР'у, кампанія зімовай дапамогі» і ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве).

24-га лістапада мопраўская брыгада выяжджае ў Барысаў у ліку 15 чалавек на чале з загадчыкам АПА АК КП(б)Б тав. Цэнцыпэрам. Барысаўскія грамадзкія арганізацыі рыхтуюцца спаткаць мопраўскія брыгады на масавым сходзе, дзе з дакладам аб чарговых задачах МОПР'у выступіць сакратар ЦК МОПР'у БССР тав. Калмык.

У сувязі з гэтым Менакругком МОПР'у заклікае ўсіх рабочых г. Барысава аказаць актыўнае садзеяньне мопраўскай брыгадзе ва ўсёй яе рабоце (на масавым сходзе, на лятучых мітынгах, пры аглядзе і абсьледваньні ячэек МОПР'у) і, галоўным чынам, у падтрыманьні прапаноў брыгады, якія будуць выносіцца на рабочых сходах на чарговых задачах МОПР'у.

Прыезд мопраўскай ударнай брыгады ў Барысаў павінен даць штуршок у працы ва ўсіх ячэйках МОПР'у, дабіцца пералому ў рабоце ўсёй раённай арганізацыі, узьняць актыўнасьць і сьвядомасьць фабрычна - заводзкіх рабочых па аказаньні дапамогі барацьбітом рэвалюцыі і падвоіць рады МОПР'у за лік новых колаў рабочых.

Трэба спадзявацца, што барысаўскія рабочыя на справе дакажуць мопраўскай брыгадзе, што яны гатовы ў любы час чула і актыўна дапамагаць барацьбітом рэвалюцыі, узмацніць працу на ўсіх ячэйках МОПР'у і актыўна ўдзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве.

Рабочыя гор. Барысава! — Мопраўская брыгада чакае вашай актыўнай дапамогі.

МЕНАКРУГКОМ МОПР'у.

На пленуме Аўтадору

Гэтымі днямі закрыўся 2-гі пленум савету Аўтадору Беларусі. На пленуме, акрамя прадстаўнікоў акруг, прысутнічалі таксама прадстаўнікі ад ячэек Аўтадору буйных прадпрыемстваў гор. Менску.

Пленум адкрыў старшыня савету тав. **Каркліп,** які ў сваім уступным слове спыніўся галоўным чынам на вялікім значэньні аўтатранспарту ў справе індустрыялізацыі і калектывізацыі краіны.

У сваім справаздачным дакладзе старшыня прўленьня Аўтадору тав. **Сташэўскі** сказаў:

— Аўтадор існуе каля двух год са дня яго арганізацыі. Калі на першае кастрычніка 1928 г. ячэек Аўтадору было 212, то зараз ёсьць ужо 552. Афармлена 29.160 членаў ячэек, а з неафармленымі налічваецца каля 40 тысяч. Далей тав. Сташэўскім спыніўся на разьвіцьці аўтамабілізацыі і на дарожным будаўніцтве.

Пленум заслухаў даклад тав. **Яцкевіча** аб пяцігадовым плане разьвіцьця дарожнай і аўтамабільнай гаспадаркі Беларусі.

Зараз Беларусь мае розных аўтамашын 296. Гэта зусім мізэрная лічба.

Пяцігадовы плян прадугледжвае завезьці ў БССР 5.400 аўтамашын: легкавых—1.360, грузавых—3.583, аўтабусаў—457 і матацыклаў—500 штук. Паводле пляну, да канца 1933 году, аўтатранспарт дасьць эканоміі па грузаперавозках 5.300.000 руб. і пасажырскіх—4.960.000 руб.

Для арганізацыі міжгародных аўтабусных эпосін, а таксама для канцэнтрацыі грузавых перавозак паводле пяцігадовага пляну прадугледжана арганізацыя Беларджаўтатранспарту.

Дрэнна абстаіць справа з падрыхтоўкай кадраў. Зараз беспрапоўных шофэраў няма. Да канца пяцігодкі патрэбна 6.024 шофэры, цэлы рад мэханікаў, тэхнікаў і інжынэраў.

Дзяржаўнымі курсамі мяркуецца падрыхтаваць у 1929-30 годзе—450 чалавек, а да канца пяцігодкі—3.567 чал. Па лініі Аўтадору мяркуецца падрыхтаваць 2.450 чалавек.

З 1-га сьнежня намечана адкрыць 6-месячныя курсы пры Віцебскім палітэхнікуме з прапускной здольнасьцю 200 чал., з і студзеня 1930 г. Наркамправы бярэ на сябе падрыхтаваць 200 чал. шофэраў. Паводле пляну намечаны цэлы рад курсаў у розных гарадох Беларусі.

На падрыхтоўку кадраў патрэбна будзе каля 2 міл. руб. Аўтадор на гэту мэту дасьць звыш 50 тыс. руб.

Вытворчая камісія ў баку ад спаборніцтва

(Завод «Энэргія», Менск)

Выпікі сацспаборніцтва на чырвонаштандартным заводзе «Энэргія» ня вельмі пахвальныя.

Тлумачыцца гэта тым, што вылучаны штаб кіраўніцтва сацспаборніцтвам зусім бязьдзейнічаў. Ён нават не падумаў арганізаваць, як належыць, ударнікаў. А ў выніку гэтага тыя дасягненьні (зьніжэньне браку, зьмяншэньне прагулаў), якія мы мелі ў пачатку спаборніцтва, былі страчаны. Наадварот, працоўная дысцыпліна паслабела, прастої здараюцца ўсё часьцей і часьцей.

Лявон ФРЫД.

Адкрыты ліст да бюро Менскай філіі БЕЛАПП

Мы, курсанты Беларускай Аб'яднанай Вайсковай Школы імя ЦВК БССР, сабраліся 19-га лістапада на вечар, прысьвечаны беларускай пралетарскай літаратуры. Мы ўвесь вечар чакалі запрошаных для ўдзелу ў вечары беларускіх пісьменьнікаў—Якуба Коласа, Маракова, Вечара, Фаміна, Хурсіка, Кавяля, Хадыку, Моркаўку і Плаўніка. Але, акрамя паважанага Якуба Коласа, ні адзін з названых вышэй пісьменьнікаў не зьявіўся. Мы лічым, што такія адносіны да нас асобных пісьменьнікаў ня спрыяюць узмацненьню сувязі паміж пісьменьнікамі і курсантамі.

Па даручэньні сходу—ПРЭЗЫДЫУМ.

Падручнік для адзінай партшколы гораду «Азбука Ленінізма» Леонцьцева і Кержанцава (на беларускай мове) рассылаецца. Дадатнова будзе распаўсюджана 12 гутарка.

Вясновы падручнік Альховага будзе рассылацца праз. тыдзень.

АПАД ЦК КП(б)Б.

9 тыраж 1-ай пазыкі індустрыялізацыі

Табліца выйгрышаў

На вячэрнім пасяджэньні 20-XI тыражнай камісіяй было разыграна: у 5.000 р. адзін выйгрыш, на 1.000—два выйгрышы па 250 руб.—300 выйгрышаў і па 100 руб.—997 выйгрышаў, а ўсяго 1.000 выйгрышаў на суму 181.700 рублёў, якія выпалі на наступныя №№ сэрый і аблігацый:

№№ сэрый	№№ аблігацый	Сума выйгрышу
000654	1-50	100
002890	1-50	100
010519	45	1.000
010519	1-44; 46-50	100
016954	1-50	100
023398	1-50	100
035164	03	1.000
035164	1-2; 4-50	100
048326	1-50	250
049460	1-50	100
061578	1-50	250
063692	1-50	250
072287	1-50	100
072897	1-50	250
074599	1-50	100
083165	05	5.000
083165	1-4; 6-50	100
084170	1-50	100
092925	1-50	100
099960	1-50	250
103032	1-50	100
114218	1-50	100
121928	1-50	100
123649	1-50	250
128736	1-50	100
131129	1-50	100
136147	1-50	100
146751	1-50	100
150351	1-50	100

На ранішнім пасяджэньні 21-XI тыражнай камісіяй было разыграна: па 5.000 руб.—5 выйгрышаў, па 1.000 руб.—23 выйгрышы, па 250 руб.—600 выйгрышаў, па 100 руб.—5.872 выйгрышы, а ўсяго 6.500 выйгрышаў на суму 785.200 рублёў, якія выпалі на наступныя нумары сэрый і аблігацый:

№№ сэрый	№№ аблігацый	Сума выйгрышу
000104	1-50	100
001067	34	1.000
001067	1-33; 35-50	100
001318	1-50	100
001415	1-50	100
002058	1-50	100
002181	1-50	100
002433	1-50	250
004189	1-50	100
006073	1-50	100
006799	1-50	100
010031	1-50	100
012444	12	1.000
012444	1-11; 13-50	100
014008	1-50	100
014009	1-50	100
014725	1-50	100
016897	1-50	100
017794	1-50	100
020100	1-50	100
020918	1-50	100
025054	17	1.000
025054	1-16; 18-50	100
027353	1-50	100
027953	1-50	100
028684	21	1.000
028684	1-20; 22-50	100
029148	1-50	100
030678	06	1.000
030678	1-5; 7-50	100
030968	1-50	100
031262	1-50	100
031537	1-50	100
032239	1-50	250
033083	37	1.000
033083	1-36; 38-50	100
033444	1-50	100
033525	1-50	100
034415	47	1.000
034415	1-46; 48-50	100
036016	1-50	100
036092	1-50	100
037662	1-50	100
039726	39	1.000
039726	1-38; 40-50	100
040597	1-50	100
040686	1-50	250
040930	04	1.000
040930	1-3; 5-50	100
045645	1-50	100
047336	42	1.000
047336	1-41; 43-50	100
047449	1-50	100
047514	1-50	100
050586	1-50	100
050815	36	1.000
050815	1-35; 37-50	100
052166	1-50	100
052979	12	5.000
052979	1-11; 13-50	100
053145	40	5.000
053145	1-39; 41-50	100
053235	1-50	100
053807	1-50	250
054248	1-50	100
054613	1-50	100
056678	1-50	100
056890	35	5.000
056890	1-34; 36-50	100
059427	1-50	100
059523	1-50	100
060627	1-50	100
063401	17	1.000
063401	1-16; 18-50	100
064389	19	1.000
064389	1-18; 20-50	100
064992	1-50	100
069366	1-50	100
069496	19	1.000
069496	1-18; 20-50	100
070487	1-50	100
071171	1-50	100
071741	1-50	100
072194	45	1.000
072194	1-44; 46-50	100
074292	1-50	100
077496	1-50	100
077719	1-50	100
079773	1-50	250
080043	1-50	100
082781	1-50	100
085915	1-50	250
085959	1-50	100
088400	1-50	100
088927	1-50	250
090885	1-50	100
090933	1-50	100
091994	1-50	100
098434	1-50	100
104934	1-50	100
106314	1-50	250
106533	1-50	100
108953	1-50	100
110380	39	1.000
110380	1-38; 40-50	100
112204	1-50	100
112606	41	5.000
112606	1-40; 42-50	100
113175	1-50	100
113486	1-50	100
113740	1-50	100
113895	1-50	100
118370	1-50	100
118731	1-50	100
119267	1-50	250
119289	1-50	100
119902	1-50	100
121374	1-50	100
122894	1-50	100
123251	1-50	100
124372	1-50	100
126717	1-50	250
129855	1-50	100
131907	35	5.000
131907	1-34; 36-50	100
134880	04	1.000
134880	1-3; 5-50	100
135115	1-50	100
135180	1-50	100
138844	1-50	100
139240	1-50	100
139658	1-50	100
140415	1-50	100
141010	1-50	100
142745	1-50	250
142990	31	1.000
142990	1-30; 32-50	100
143101	1-50	100
145892	1-50	250
147698	1-50	100
148169	48	1.000
148169	1-47; 49-50	100
148712	1-50	100
149859	1-50	100
150465	17	1.000
150465	1-16; 18-50	100
151403	30	1.000
151403	1-29; 31-50	100
153824	1-50	100
154286	23	1.000
154286	1-22; 24-50	100
155426	1-50	100
155968	1-50	100
156419	1-50	100
156548	1-50	100
157290	35	1.000
157290	1-34; 36-50	100
159528	1-50	100

Старшыня тыражнай камісіі—нам. старшыні Віцебскага АВК САПРЫЦКІ.

Адказ. сакратар тыражнай камісіі ад НКФ СССР СІВАЛДАЕЎ.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Клюб Саўгандальслужачых. 23 лістапада, а 8-й гадзіне увечары—першыя заняткі гуртка вайсковых ведаў 1-й ступені групы спартсмэнаў.

24 лістапада, а 7-й гадз. увечары арганізацыйны сход 4-х жаночых груп вайсковага гуртка.

Заняткі груп фізвыхаваньня: па аўторках і суботах—мужчынская група ад 8-9 гадз. увечары, па панядзелках і серадох—жаночая група ад 7-8 гадз. увечары. Запіс у гурткі фізвыхаваньня ў канцылярыі клюбу штодзённа ад 6—10 гадз. увечары.

Дом Асьветы. 23 лістапада а 7-й гадз. увечары адбудзецца агульны сход ячэйкі ЛКСМ Белпрацасьветы.

Сёньня канцэрт заслужонага артыстага рэспублікі, праф. М. Эрдэнка. Пачатак а 9-й гадз. У 7 гадз. увечары заняткі шахматна-шашачнага гуртка.

Клюб навуковых працаўнікоў. У суботу, 23-га лістапада, а 8 гадз. увечары ў клюбе навуковых працаўнікоў склікаецца агульны сход навуковых працаўнікоў гор. Менску з наступнай абвесткай дня:

1. Аб адчыненьні ВТНУ—дакладчык тав. **Платун** і судакладчык прафэсар **Серада** (ВСНГВ).
2. Аб бесьперапыным вытворчым годзе ў ВНУ—праф. Вальфсон.
3. Бягучыя справы.

Дом Камасьветы. 23-XI г. г., а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні партгабінэту Дому Камасьветы АПА АК КП(б)Б склікаецца нарада ўсіх таварышоў, якія займаюцца самаадукацыяй.

Менакрсавет саюзу ваяўнічых бязбожнікаў даводзіць да ведама ячэек СВБ гораду Менску, што для вядзеньня масавае антырэлігійнае прапаганды вызначаюцца наступныя дні: для масавае працы ячэек СВБ 1, 11, 21 кожнага месяца.

Для працы антырэлігійнага дэкаднага унівэрсытэту (у памяшканьні фізычнай аўдыторыі БДУ) 2, 12, 22, а 6½ гадз. увечары.

Для працы па індывідуальнай кансультацыі для ячэйкавага актыву (пры агітпрап. габінэце АК КП(б)Б—клюб Камасьветы) 5, 15, 25, а 7 гадз. увечары.

Наведваньне кансультацый ячэйкавага актыву, асабліва кіраўнікоў антырэлігійнымі гурткамі, сакратароў і апоргаў ячэек СВБ неабходна.

Фрунзаўскі Райком Мопр'у выклікае ў райком (Савецкая, 87) у нядзелю, 24-га лістапада, а 7 гадз. увечары сакратароў і старшынь наступных ячэек Мопр'у:

Заводу **«Камунар»,** заводу «Беларусь» бэтоннага за[illegible] кірпічнага заводу, цагельні Белдзяржбуду № № 1 і 3, цагельні Гандальбуду, друкарні «Зьвязда», канвэртнай фабрыкі, камгасу, Меншвэю, мэталётрэсту, мясцкому хімікаў, Наркамправы, Наркамгандлю, Нарсувязі, Нарасьветы, пажарнай каманды, працкалектыву «Паліграф», «Чырвоны Тэкстыльшчык», ад хлебазаводу, працкалектыву буфэтчыкаў, 2 п-к абутнікаў, 1, 2, 3 і 4 аддзяленьняў міліцыі, школы міліцыі і ўсіх сакратароў вайсковых ячэек Мопр'у Фрунзаўскага раёну.

Клюб Нархарч. У нядзелю, 24-га лістапада, а 3-й гадз. дня адбудзецца чарговы сход дэлегатак ячэйкі Нархарч у клюбе Нархарч (вул. Энгельса, 6).

ЦКК КП(б)Б просіць таварышоў, якія ведаюць адрас члена партыі тав. Габрыель А. І., паведаміць Парткалегіі ЦКК КП(б)Б (Савецкая, 55, пакой 18).

Кастрычніцкі Райком МОПР'у выклікае на 25 лістапада, на 7 гадз. увечары ў райком для інфармацыі аб ходзе зімовае дапамогі і аб становішчы ячэек сакратароў наступных ячэек: заводу «Энэргія», АБВШ, 3-й амбуляторыі, Белмясгандлю, клюбу імя Леніна, дражджавога заводу «Чырвоная Зорка», МПШУ, клюбу імя Розы Люксэмбург, мясцкому № 1-пасажырская, Пратэзнай майстэрні, УМТ'у, Хэмфармзаводу, ФЗУ, дзіцячай клініцы, Саюзхлебу, арцелі «Чырвоная Зорка», Аўтапрамгандлю, нэрвовай клініцы. Яўка абавязкова.

Клюб саўгандальслужачых. З 24-га лістапада бібліятэка і чытальня клюбу будзе адкрыта ў цотныя чыслы кожнага месяца ад 3—4 з палов. гадзін дня і ад 6—9 гадз. увечары, а ў няцотныя —ад 6—10 гадз. увечары.

Камвуз. АПА Менакругкому і праўленьне камвузу імя Леніна просіць зьявіцца 28-га лістапада а 6-й гадз. увечары ў памяшканьне камвузу наступных таварышоў: Рыўліна, Югава, Стальнога, Гесэна, Ігнатоўскага, Фэйгэльсона, Будкевіча, Мазэля, Сэрбэнту, Каранеўскага, Сякерскую, Канапліна, Сянкевіча, Лур'е, Гурэвіча, Тамашэвіча, Пікуса, Акура, Аксэльрода, Будзінскага, Стракоўскага. Выдру, Саевіча, Галандза, Вальфсона, Вайнштэйна, Валабрынскага, Васкабойнікава, Гольштэйна, Карклі-на, Галадзеда і Гантмана.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

НАБЛІЖАЕЦЦА КАНЕЦ ПАДПІСНОГА МЕСЯЦА

ЯЧЭЙКІ! Не марудзячы, УЗМАЦНЯЙЦЕ работу па распаўсюджаньні „ЗЬВЯЗДЫ" сярод партыйных і беспартыйных мас.

ВЫКОНВАЙЦЕ ПАСТАНОВЫ ПАРТЫЙНЫХ ОРГАНАЎ

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

И. Дауншольскі.

Субота, 23 лістапада для саюзу харчавікоў. Білеты ў саюзе.

Паядынак машын.

Пачатак спэктакляў роўна а 8 г. 30 м.

Д. БЭРГЕЛЬСОН.

Нядзеля, 24 лістапада для саюзу саўгандальслужачых. Білеты ў саюзе.

ГЛУХІ

Пачатак роўна а 8 г. 30 м.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

Мастацкі замежны фільм

Праект інжынэра Строгга

Звыш праграмы кіно-хроніка Белдзяржкіно

Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

КІНО [illegible]

2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі

Амэрыканскі фільм

НЕБАСКРОБ

Звыш праграмы хроніка „Совкино" № 60

КІНО [illegible]

популярны комік БЭСТЭР КІТОН у амэрыканскай камэдыі

ГЕНЭРАЛ

у 7 частках.

Звыш праграмы кіно-хроніка „Совкино" № 64

Пачатак—а 7 г. увеч. Каса—ад 5 з пал. г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Чырвоны Піянэр"

ЖЫВЫЯ ДАМЫ

у 5 частках выварчасьця Белдзяржкіно.

Звыш праграмы цікавая камэдыя

Адна з тых, якіх шмат

у 2 частках

Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня.

КІНО СПАРТАК

ГАСТРОЛІ ФРЫНЫ **КАЛЬЦОВАЙ,**

выканальніцы сьпеваў быту, сьпеваў народаў.

На экране мастацкі баявік

У горад уваходзіць нельга

У гал. ролях А. М. Тайдзе, Л. Л. Леанідаў, К. В. ЭГЕРТ. Пач. а 6 г. 30 м. Каса ад 5 г.

У сувязі з пастановай Саюзнага Савету Сац. Страхаваньня пры НКПрацы СССР ад 19-X 1929 г. № 350, згодна якой ад беспрацоўных рабочых і служачых членаў прафсаюзаў для прызначэньня дапамогі па беспрацоўі патрабуецца 2-х **гадовы працоўны стаж,** а ад ня членаў саюзаў—3-х **гадовы працоўны стаж,**

МЕНАКРСТРАХКАСА з 24 лістапада г. г.

прыступае да праверкі права на дапамогу ўсіх беспрацоўных, якія атрымліваюць дапамогу па беспрацоўі.

Для праверкі ўсе беспрацоўныя павінны прадставіць на Біржу Працы свае дакументы аб працоўным стажы.

Абвестка аб парадку і тэрміне праверкі вывешана на Біржах Працы, у Страхкасе і ў памяшканьнях ЦП саюзаў.

Беспрацоўным, якія не прайшлі праверку, дапамога па беспрацоўі **выплачвацца ня будзе.**

МЕНАКРСТРАХКАССА.

Да ведама падпісчыкаў і анонсадаўцаў

ГАЗЭТА «ЗЬВЯЗДА» З 11 ЛІСТАПАДА Г. Г.

ВЫХОДЗІЦЬ і па ПАНЯДЗЕЛКАХ

Замест панядзелка газэта ня выходзіць па чацьвяргох.

Галоўная кантора газ. «Зьвязда» (Савецкая, 63, 3-ці паверх) адкрыта штодзённа, акрамя серады, ад 9 гадз. раніцы да 5 гадз. увечары.

Для здачы АБВЕСТКІ у газэту **„ЗЬВЯЗДА"** званіце па тэл. **7-81**

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты **„ЗЬВЯЗДА"** званіце па тэл. **2-49**

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

50 К. Кошт публікацыі аб згубе дакумантаў

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

Згубленыя і ўкрадзеныя наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Асабовая кніжка Шухмана Н. Г., выд. б. Каменскім ВВК 1038

Вучотна-конская кніжка Кавалева Ц., выд. Расонск. РВК 1039

Дапрывыўн. кніжка Ланеўскага М. Я., выд. Расон. РВК 1040

Чл. білет саюзу будаўнікоў № 53882 Сіверына У. І.

Вуч.-конская кніжка Войтэва А. І., выд. Калінкавіцк. РВК 1042

Чл. білет саюзу гарнякоў № 284, в